

ЯЎГЕН КРЫЖАНОЎСКІ ПРА СВАІХ ЖАНЧЫН

Сямейная газета

ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ПАЧЫНАЕЦЦА — ГЛЯДЗІМ ФУТБОЛ! 13





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 112 (28728)


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Андрэй ШОРАЦ, старшыня Мінскага гарвыканкама:**

*«Хацелася б, каб рэгіянальныя саветы па развіцці прадпрымальніцтва працавалі актыўна не толькі ў частцы ўнясення прапаноў па змяненні заканадаўства, але і па рашэнні канкрэтных пытанняў. Мы гатовыя прымаць удзел у рабоце прадпрыемстваў, праз бюджэт льгатаваць працэнтныя стаўкі, здаём у арэнду на льготных умовах нерухомую маёмасць, асвойваем інавацыйны фонд, хоць і не ў той ступені, як хацелася б. Наша задача — каб усе ідэі прадпрымальнікаў, якія дазволяць ствараць працоўныя месцы, павышаць зарплату, павялічваць падатковыя паступленні, ажыццяўляліся якасна і без перашкод».*

## КОРАТКА

- **Анлайн-канферэнцыя на тэму «Дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога» пройдзе сёння, 14 чэрвеня, у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**
- Забарона на наведванне лясоў уведзена ў 21 з 22 раёнаў Мінскай вобласці. Забаронена наведванне лясоў грамадзянамі, а таксама ўезд транспарту, за выключэннем службовага.
- **У Францыі на аўкцыёне Sotheby's прадалі кітайскую фарфоравую вазу часоў праўлення імператара Цяньлун (1736—1795 гады) з дынастыі Цын за рэкордныя для гэтага аўкцыёну 16,2 млн еўра.**



- У Беларусі могуць скараціць тэрміны планавага адключэння гарачай вады летам.
- **У амерыканскім Сен-Поле, штат Мінесота, янот забраўся на самы верх 23-павярховага будынка. CBS у прамым эфіры трансліраваў «падзею», уся Амерыка сачыла за лёсам жывёлы.**



# КУПІСК ЭСТАФЕТУ ПРЫНЯЎ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Старэйшына вёскі Купіск, пенсіянер, былы інжынер калгаса Барыс ВЕЯЎНІК у вольны час займаецца пляценнем кашоў. Да свята вёскі наплёў іх цэлы тузін. Яму дапамагалі ўнукі Андрэй і Аляксандр, якія прыехалі да дзеда на канікулы.**

**На тэрыторыі Любчанскага сельсавета Навагрудскага раёна знаходзіцца дваццаць тры населеныя пункты. Шэсць гадоў таму было прынята рашэнне, каб кожнае лета ў адным з іх праводзіць свята вёскі. Рашэнне падтрымалі, і за гэты час ушанавалі вёскі Чарэшлю, Вераскава, Галынь. Вось так і зарадзілася новая традыцыя. Потым адзначылі святы ў самой Любчы і вёсцы Бор, якая знаходзіцца на правым беразе Нёмана. А сёлета святочную эстафету прыняла наднёманская вёска Купіск. Тым больш што ў гэтага населенага пункта сёлета сапраўды прыгожая дата — 550 гадоў з часу згадвання ў старажытным летапісе.**

СТАР. 4

■ Датычыцца кожнага

# НА ЎСЯКІ ВЫПАДАК

## Якіх бед часцей за ўсё асцерагаюцца беларусы, набываючы страхавы поліс?



### Ненавязлівы заморскі сэрвіс

**Мінчанін Віктар з горкай самаіроніяй успамінае сваё леташняе падарожжа ў Новую Зеландыю. «І варта было ляцець на другі канец свету, — кажа ён, — каб палюбавацца столлю бальнічнай палаты!» Амаль адразу пасля прызямлення на далёкіх астравах у вандроўніка здарыўся прыступ апендыцыту. Як тут было не пашкадаваць аб звычцы спадзявацца на «а раптам праняссе?». Збіраючыся ў другое паўшар'е на некалькі дзён у госці да прыяцеля, Віктар не палічыў за неабходнае набыць медыцынскую страхоўку. Аперацыя разам з тэрапеўтычнымі працэдурамі пацягнула на некалькі тысяч новазеландскіх долараў. Прыйшлося раскашэльвацца.**

Падобных выпадкаў, калі беларусы едуць за межы сваёй краіны без аніякай страхоўкі, апошнім часам становіцца ўсё менш. Перспектыва за свой кошт апынуцца ў руках заморскіх эскулапаў нікога не прываблівае. Бо адбыцца можа і штонебудзь больш сур'ёзнае за апендыцыт. Плаці тады са сваім скупым заробкам увесь астатак жыцця за іншаземны «ненадакучлівы сэрвіс».

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# НЕ НАЗІРАЛЬНІКІ, А ПРЫХІЛЬНІКІ

## За апошні год у беларуска-ўзбекскіх адносінах было зроблена больш, чым за 20 папярэдніх гадоў

**Такое меркаванне выказаў кіраўнік нашай краіны Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй Сената Олій Мажліса Узбекістана Нігмацілой Юлдашавым. Гэта першы візіт спікера верхняй палаты парламента Узбекістана ў Беларусь.**

«За апошні год — можа, крыху больш, калі браць новую эпоху, як я часта свайму сябру Шаўкату (Прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў. — **«Зв.»**) кажу — мы ў беларуска-ўзбекскіх адносінах зрабілі значна больш, чым за 20 папярэдніх гадоў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле слоў беларускага лідара, яго заслуга тут мінімальная — гэта заслуга Прэзідэнта Узбекістана Шаўката Мірзіёева, які, будучы прэм'ер-міністрам, «пабачыў увесь свет, спакойна ацаніў сітуацыю не толькі на восі Мінск—Ташкент, але і па ўсіх напрамках — і здзейсніў даволі вялікі рывок».

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што казаў пра гэта ўзбекскаму лідару на саміце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. «Тое, што вы зрабілі ў міжнародных адносінах за апошні час, апусціўшы іх на базу эканомікі, мне здаецца, ні адной з дзяржаў у свеце, тым больш постсавецкай прасторы, не ўдалося зрабіць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Вы проста малайцы за гэтыя гады. Вы адкрыліся свету і падчас гэтага адкрыцця атрымалі максімум, што маглі атрымаць».

На думку кіраўніка дзяржавы, дыпламатыя і палітыка — гэта добра, пагаварыць можна заўсёды, а вось адчуць, дакрануцца да выніку — гэта важней, што і ўдалося зрабіць Узбекістану. «Гэта найвялікшая заслуга кіраўніцтва вашай краіны», — дадаў ён.

Беларускі лідар падкрэсліў: сведчаннем прарыву Узбекістана на міжнароднай арэне і ў міжнародных адносінах служаць яго адносіны з Беларуссю. Кіраўнік дзяржавы вельмі пазітыўна ацэньвае гэты аспект, паколькі бакі зрабілі амаль усё, што сумесна запланавалі.

Таксама Прэзідэнт нагадаў аб размове з Шаўкатам Мірзіёевым, падчас якой кіраўнік дзяржаў дамовіліся: перш чым праводзіць афіцыйную сустрэчу, неабходна нешта зрабіць, стварыць задзел, каб «мы маглі ўзбекскаму і беларускаму народам пакласці нешта на стол».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што праблем хапае ва ўсіх, у любой дзяржаве, і выказаў упэўненасць, што Узбекістан у найбліжэйшую пяцігодку вырашыць усе вострыя пытанні і складанасці. З гэтымі задачамі можна справіцца з дапамогай людзей, прыродна-кліматычных умоў, высокіх тэмпаў мадэрнізацыі эканомікі і грамадства.

«Але вы павінны памятаць, што мы — не проста пабочныя назіральнікі гэтых працэсаў, не проста заўзятары — мы, вядома, радуемся вашым поспехам — мы актыўныя прыхільнікі і, калі хочаце, рухавікі таго прагрэсу, які вы ажыццяўляеце ва Узбекістане. Вы на нас можаце разлічваць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Старшыня Сената Олій Мажліса Узбекістана Нігмаціла Юлдашаў адзначыў, што ў яго краіне з вялікай павагай ставяцца да беларускага Прэзідэнта. Паводле яго слоў, ва Узбекістане радуюцца тым поспехам, якіх Беларусь дасягнула пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашэнкі, і міжнароднаму аўтарытэту нашай дзяржавы, які расце.

«Мы ведаем і высока цэнім тое, што вы заўсёды надавалі і надаяце вялікае значэнне развіццю супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі і нашымі народамі», — падкрэсліў ён.

Нігмаціла Юлдашаў асаблівую ўвагу звярнуў на той факт, што ў жалобныя для ўзбекскага народа дні Аляксандр Лукашэнка адмыслова наведаў гэтую краіну, каб ушанаваць памяць першага Прэзідэнта Узбекістана Іслама Карымава.

Дэлегацыя з Узбекістана прыбыла ў нашу краіну 11 чэрвеня. Як паведамляла «Звязда», напярэдадні Нігмаціла Юлдашаў правёў сустрэчы з прэм'ер-міністрам Андрэем Кабяковым, старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаілам Мясніковічам і старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімірам Андрэйчанкам.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# Візіт на чэмпіянат

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка па запрашэнні Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна плануе наведаць цырымонію і матч адкрыцця чэмпіянату свету па футболе, паведамляе БЕЛТА са спасылкай на прэс-сакратара кіраўніка беларускай дзяржавы Наталлю Эйсмант.**

Адкрыццё мундзіяля адбудзецца сёння, 14 чэрвеня, на маскоўскім стадыёне «Лужнікі». З нагоды чэмпіянату свету па футболе ў сталіцу Расіі прыбудзе шэраг замежных лідараў, якія будуць прысутнічаць на цырымоніі адкрыцця.

■ Саюзная дзяржава

# ТЭМП НЕ ЗБАЎЛЯЕМ

**Пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы прайшло ўчора ў Маскве. Парадак дня ўключаў 14 пытанняў з акцэнтам на гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве дзвюх краін. «Наша агульная задача — знайсці ўзаемавыгадны кампраміс для забеспячэння справядлівасці і роўнай канкурэнцыі», — адзначыў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ.**

У полі зроку застаюцца пастаўкі на расійскі рынак беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама ўдзел нашых прадпрыемстваў, якія займаюцца вытворчасцю і зборкай тэхнікі ў Расіі, у дзяржзакупках і праграмах субсідзіравання.

— Замацаваны ў 2017 годзе пазітыўны трэнд да аднаўлення эканамічнага росту ў нашых краінах знайшоў адлюстраванне ў выніках двухбаковага гандлю. За мінулы год узаемны тавараабарот павялічыўся на 23,5 % і склаў $32,4 млрд. Прычым узаемны тавараабарот больш чым на 80 % забяспечаны плацяжамі ў нацыянальных валютах, перш за ўсё, у расійскім рублі. Добра было б, калі б увесь узаемны тавараабарот і ў галіне цэнаўтварэння фарміраваўся выключна ў нацыянальных валютах — беларускіх і расійскіх рублях, — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

Па словах беларускага прэм'ер-міністра, стратэгічнай задачай можа быць выхад на ўзровень тавараабароту ў $40 млрд, які некалькі гадоў таму быў дасягнуты. Кіраўнік расійскага ўрада Дзмітрый Мядзведзеў звярнуў увагу, што пазітыўную тэндэнцыю дзяржавы не губляюць: за чатыры месяцы гэтага года рост тавараабароту склаў 17 %. Пры гэтым прэм'ер-міністр Расіі канстатаваў: «Ёсць і тое, чым належыць займацца, над чым працаваць: нам трэба і далей рухацца ў бок ліквідацыі перашкод для доступу тавараў і паслуг, ствараць роўныя правілы для вядзення бізнесу».

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ТУРЦЫІ АДКРЫЛІ ГАЗАПРАВОД TANAP



У турэцкай правінцыі Эскішэхір прайшла цырымонія адкрыцця Трансанаталійскага газаправода (TANAP), прызначанага для транспарціроўкі газу з Азербайджана ў Еўропу. На мерапрыемства прыехалі прэзідэнты Турцыі, Азербайджана, Сербіі, Украіны, а таксама лідар непрызнанай Турэцкай Рэспублікі Паўночнага Кіпра, перадае РІА «Навіны». Рэджэп Таіп Эрдаган асабліва падкрэсліў, што будаўніцтва магістралі ўдалося скончыць раней тэрміну. «Гэта будзе самы вялікі газаправод у Еўропу», — заўважыў ён. Эрдаган падкрэсліў, што праект TANAP наблізіў Турцыю да ператварэння ў энергетычны хаб, перадае «Інтэрфакс». Прэзідэнт таксама паабяцаў, што першыя пастаўкі газу ў ЕС пачнуцца ў чэрвені 2019 года.

### АБВЕШЧАНА НОВАЯ НАЗВА МАКЕДОНІІ

Новая назва былой югаслаўскай рэспублікі Македонія восенню будзе вынесена на афіцыйны рэферэндум. Пра тое, што краіна цяпер будзе называцца Рэспубліка Паўночная Македонія, было абвешчана напярэдадні па выніках перамоў грэчаскага і македонскага прэм'ер-міністраў. Спрэчка паміж Афінамі і Скоп'е па гэтым пытанні вялася на працягу 25 гадоў. «У дасягнутым пагадненні ўпершыню адзначаецца, што нашы паўночныя суседзі не маюць дачынення да антычнай грэчаскай дзяржавы Старажытная Македонія, і таму ў будучыні яны не могуць заяўляць пра такую сувязь», — падкрэсліў кіраўнік грэчаскага ўрада Алексіс Цыпрас.

### ПРЫ ВЫВЯРЖЭННІ ВУЛКАНА Ў ГВАТЭМАЛЕ ЗАГІНУЛІ 27 ДЗЯЦЕЙ

Ахвярамі вулкана Фуэга ў Гватэмале сталі непаўналетнія. Па інфармацыі міністэрства адукацыі краіны, струменямі лавы была знішчана школа ў вёсцы Сан-Мігель-Лос-Лотэс. Населены пункт апынуўся пад пластом попелу, граз і камянёў. Ужо апазнаны целы 27 навучэнцаў, яшчэ 35 чалавек прапалі без вестак, перадае ТАСС. Наступствы самага магутнага за апошнія гады вывяржэння Фуэга закранулі больш за 1,7 млн чалавек. Паводле апошніх звестак, загінулі 120 мясцовых жыхароў, але тыя, хто шукае сваіх блізкіх пасля трагедыі, заяўляюць, што зніклі сотні людзей. Фуэга знаходзіцца за 40 км на паўднёвы захад ад сталіцы краіны. Яго вышыня — 3,7 км. Вулкан уваходзіць у лік самых актыўных на тэрыторыі Гватэмалы. Днямі стала вядома, што Фуэга зноў актывізаваўся.

■ Спрэчны момант

# ДЗЕЛЯ БАЛАНСУ ІНТАРЭСАЎ

## МАРГ канстатуе пагаршэнне канкурэнтнага асяроддзя ў гандлі з-за імклівага развіцця гандлёвых сетак

**Прадстаўнікі дзяржорганаў і малога бізнесу выступілі супраць пашырэння манаполіі буйных гандлёвых сетак у краіне падчас пасяджэння грамадска-кансультатыўнага савета пры Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю.**

У рамках адкрытага абмеркавання з удзелам міністэрстваў і бізнес-асацыяцый разглядалася прапанова кампаніі «Еўрагандаль» аб зняцці інфраструктурнага абмежавання развіцця гандлёвых сетак пры дасягненні долі 20 % у аб'ёме рознічнага тавараабароту харчовых тавараў. Кампанія, якая валодае сеткай крамаў «Еўраопт» і «Бруснічка», прапаноўвала павялічыць гэтую долю да 35 % або цалкам зняць абмежаванні.

### Не жадаюць працаваць на вёсцы

**Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ** адзначыў, што міністэрства падтрымлівае развіццё гандлёвых сетак і інфраструктуры, але з'яўляецца праціўнікам манапалізацыі.

«Лічбы па долях гандлёвых сетак з'яўляюцца закрытымі, але магу сказаць, што адзіная сетка, якая наблізілася да парога ў 20 % — гэта «Еўрагандаль». Далей ідзе сетка «Карона», якая мае ў восем разоў меншую долю. З гэтага можна зрабіць выснову, што сёння змяненне нормы наўрад ці будзе садзейнічаць павелічэнню доляў іншых сетак і павелічэнню канкурэнцыі на рынку», — паведаміў Уладзімір Калтовіч.

Таксама, па яго словах, беларускія вытворцы заяўляюць аб праблемах з трапляннем на паліцы сеткавых крамаў. Ад іх патрабуюць вялікіх зніжак, якія не адчувае пакупнік. Акрамя таго, гучаць скаргі на высокія гандлёвыя надбаўкі. Назіраецца і ўзмацненне дыскрымінацыі пастаўшчыкоў, што пацвердзілі прадстаўнікі канцэрна «Белдзяржхарчпрам».

Як адзначыла ў сваім дакладзе **начальнік упраўлення гандлю, прамысловасці і аграпрамысловага комплексу МАРГ Віялета БРАЗОЎСКАЯ**, паводле звестак гандлёвага рэестра за апошнія чатыры гады колькасць харчовых крамаў сеткі «Еўраопт» павялічылася больш чым у пяць разоў і на 30 мая 2018 года склала 626 адзінак (3,54 % ад агульнай колькасці крамаў краіны). Толькі 96 з іх (15,4 %) размешчаны ў сельскіх раёнах. Пры гэтым сеткай перавышана значэнне долі 20 % у аб'ёме рознічнага тавараабароту харчовых тавараў на тэрыторыі 56 раёнаў і гарадоў.

На думку МАРГ, у выпадку, калі суб'ект займае долю звыш 20 %, прысутнічаюць рызыкі павелічэння цэн. «Акрамя таго, існуюць рызыкі па парушэнні правоў спажыўцоў, калі гандлёвая сетка спыніць сваю дзейнасць. Міністэрства выступае за баланс інтарэсаў: з аднаго боку — гэта развіццё рознічнага гандлю, з другога — мы стаім на абароне правоў спажыўцоў», — падкрэсліў першы **намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Артур КАРПОВІЧ.**

Ён звярнуў увагу, што, згодна з Указам № 345, на 37 % тэрыторыі Беларусі не ўжываецца згаданае абмежаванне ў 20 %. «У адпаведнасці з рашэннем аблвыканкамаў пад гэты ўказ патрапіла больш за 15 тысяч сельскіх населеных пунктаў. Калі паглядзець, у якія сельскія населеныя пункты зайшла названая гандлёвая сетка — гэта ўсяго 34 пункты. Гэтай сетцы ёсць дзе развівацца ў сельскай мясцовасці», — дадаў ён.

У сваю чаргу **гендырэктар «Еўрагандлю» Андрэй ЗУБКОЎ** адзначыў, што ў кампаніі ёсць складанасці ў кантакце з абласнымі Саветамі дэпутатаў, якія не спяшаюцца ўзгадняць адкрыццё іх гандлёвых аб'ектаў у вёсках з насельніцтвам да дзвюх тысяч чалавек.

### Не пагадзіліся

Упершыню 20-працэнтны парог аб'ёму рознічнага тавараабароту харчовых тавараў быў уведзены ў 2014 годзе. Тады лічба нікога не турбавала, бо да гэтага парога неабходна было яшчэ дарасці. Сёння, па словах **дырэктара некамерцыйнага аб'яднання «Асацыяцыя рознічных сетак» Наталлі ШАБЛІНСКАЙ**, члены асацыяцыі пасля доўгіх дэбатаў прыйшлі да адзінага меркавання, што павялічваць долю інфраструктурнага абмежавання ўсё ж яшчэ зарана. Зараз у асацыяцыю ўваходзяць 15 буйных гандлёвых сетак, з іх 12 — харчовыя. За павелічэнне парога ў 20 % прагаласавалі дзве гандлёвыя сеткі — «Еўрагандаль» і «Дабраном», адна гандлёвая сетка прапанавала перакласці прыняцце гэтага рашэння на МАРГ, яшчэ 9 — выказаліся супраць.

«Гэта прынцыповае пытанне, але мы катэгарычныя праціўнікі развіцця адных суб'ектаў за кошт іншых. Мы паважаем буйныя сеткі і лічым, што такія прадпрыемствы павінны быць у гэтай краіне, пытанне толькі ў меры і адказнасці. Але неабходна такія рашэнні прымаць з улікам суцэльнай стратэгіі развіцця гандлю, дзе знойдзецца месца кожнаму», — пракаментаваў сітуацыю **сустаршыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Віктар МАРГЕЛАЎ.**

Па яго словах, цяпер у Мінэканоміі распрацоўваюцца прапановы па фарміраванні праграмы развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў сферы гандлю. Большасцю галасоў на пасяджэнні грамадска-кансультатыўнага савета было прынята рашэнне пакінуць у законе аб гандлі існуючае інфраструктурнае абмежаванне ў 20 %. Бізнес-саюзы, рытэйлеры, асацыяцыя рознічных сетак не падтрымалі прапанову «Еўрагандлю». У Нацыянальным банку таксама не падтрымалі павелічэнне «манапольнага парога». Там лічаць, што далейшае пашырэнне сеткі прывядзе не толькі да ўзмацнення рызык у забеспячэнні цэнавай стабільнасці, але і да рызыкі ўстойлівага функцыянавання банкаўскага сектара.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

■ Класныя навіны

# Другую змену ў гімназіях «легалізавалі»

**У гімназіях Беларусі дазволілі праводзіць навучальныя заняткі ў другую змену. Адпаведныя змяненні ў санітарныя нормы і правілы «Патрабаванні для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі» былі ўнесены пастановай Міністэрства аховы здароўя ад 3 мая 2018 года № 39.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Забарона на правядзенне ўрокаў у другую змену адмяняецца ў гімназіях, гімназіях-інтэрнатах, ліцэях, спецыялізаваных ліцэях, суворaўскіх і кадэцкіх вучылішчах, базавых школах-каледжах мастацтваў, сярэдніх школах-каледжах мастацтваў і гімназіях-каледжах мастацтваў.

У першую змену заняткі будуць праводзіцца ў 1, 2, 5, 9—11-х класах, а таксама ў 8-х класах, дзе асобныя вучэбныя прадметы вывучаюцца на павышаным узроўні. Урокі могуць праходзіць у другую змену для 6-7-х класаў, у якіх арганізавана вывучэнне асобных прадметаў на павышаным узроўні. Аднак гэта неабходна штогод да пачатку навучальнага года ўзгадняць з упраўленнямі (галоўнымі ўпраўленнямі) адукацыі аблвыканкамаў, камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама, абласнымі і мінскім гарадскім цэнтрамі гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.

Для навучэнцаў 5—8-х класаў, у якіх асобныя прадметы вывучаюцца на павышаным узроўні, максімальную дапушчальную тыднёвую вучэбную нагрузку дазваляецца павялічваць на адну гадзіну для правядзення факультатыўных заняткаў. Згодна з санітарнымі нормамі і правіламі, навучальныя заняткі ва ўстановах адукацыі павінны пачынацца не раней за восем гадзін раніцы ў першую змену і не пазней за 14 гадзін — пры арганізацыі навучальнага працэсу ў другую змену. Пры гэтым заняткі ў другую змену павінны заканчвацца не пазней за 19.30. Аптымальнай з'яўляецца арганізацыя адукацыйнага працэсу з 9.00 (у першую змену).

Пастанова ўступае ў сілу 14 чэрвеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Вышэйшая школа

# Патрабуюцца магістры камунікацыі

**Дзве новыя спецыяльнасці — «Менеджмент масавых падзейных мерапрыемстваў» і «Медыякамунікацыі» — адкрыюцца ў магістратуры БДУ. Падрыхтоўку магістраў па гэтых адукацыйных праграмах у нашай краіне распачнуць упершыню.**

Па спецыяльнасці «Менеджмент масавых падзейных мерапрыемстваў» навучанне будзе праходзіць на факультэце міжнародных адносін. Яе адкрыццё абумоўлена ростам патрэбнасці ў кваліфікаваных спецыялістах па арганізацыі міжнародных масавых мерапрыемстваў. Асабліва актуальнай праблема стала ў апошнія гады ў сувязі з пашырэннем пераліку спартыўных спаборніцтваў рознага маштабу, якія праводзяцца ў Беларусі. Дарэчы, у нашай краіне штогод арганізуецца больш за 70 спаборніцтваў міжнароднага ўзроўню.

Падрыхтоўка прафесіяналаў па названым профілі дазволіць палепшыць якасць спартыўнай і турысцкай інфраструктуры, пашырыць міжнароднае супрацоўніцтва і павялічыць рост экспарту паслуг.

Пасля заканчэння магістратуры выпускнікам будзе прысуджацца ступень — магістр кіравання. Сярод арганізацый, зацікаўленых у такіх спецыялістах, — Нацыянальны алімпійскі камітэт Беларусі, Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальнае агенцтва па турызме, «Белінтэрэкспа», турысцкія фірмы і івэнт-агенцтвы, Нацыянальны акадэмічны вялікі тэатр оперы і балета і іншыя.

Навучальны план спецыяльнасці «Медыякамунікацыі» прадугледжвае рэалізацыю дзвюх магістарскіх праграм. Рыхтаваць па магістарскай праграме «Карпаратыўныя стратэгічныя камунікацыі» будуць на факультэце журналістыкі, а па праграме «Медыядаследаванні і сацыяльная аналітыка» — на факультэце філасофіі і сацыяльных навук БДУ.

Выпускнікі гэтай спецыяльнасці атрымаюць сучасныя кампетэнцыі арганізацыйна-кіраўнічай, аналітычнай і экспертнай дзейнасці ў медыясферы, а таксама змогуць выбудоўваць эфектыўную камунікацыю з зацікаўленай аўдыторыяй.

Прыём дакументаў на ўсе спецыяльнасці магістратуры БДУ будзе ажыццяўляцца з 27 чэрвеня да 5 ліпеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Будзь у курсе!

## Аэрапорт паднімае цэны за аўтастаянку

Тарыфы на паслугі платнай ахоўваемай кругласутачнай аўтастаянкі на 1235 месцаў у Нацыянальным аэрапорце Мінск павышаюцца з 15 чэрвеня. Пры захоўванні аўтамабіля да гадзіны падаражанне складзе з 1,5 рубля да 2 рублёў, кошт доўгатэрміновай паслугі размяшчэння машыны павысіцца з 6 да 12 рублёў за суткі, з 69 да 120 рублёў за перыяд звыш 27 сутак да месяца.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Здарэнні

## «Галантныя» кавалеры

**Каля трох гадзін ночы ў сталічную міліцыю звярнуліся дзве прадаўшчыцы кветак, якія расказалі, што невядомыя ў пераходзе па вуліцы Бабруйскай скралі ў іх тавар. На месца выехаў нарад, абодва зламыснікі былі затрыманы. Гэта былі два мінчаніны 1997 года нараджэння, адзін з якіх раней судзімы.**

Па інфармацыі Кастрычніцкага РУУС г. Мінска, кампанія з чатырох чалавек, сярод якіх была і дзяўчына, адпачывала ў раёне вуліцы Магілёўскай, пасля чаго накіравалася ў бок вакзала. Маладыя людзі, спусціўшыся ў пераход, купілі для дзяўчыны півоню. Далей кампанія накіравалася да выхада з перахода, калі два хлопцы вырашылі забраць у жанчын-прадаўцоў кветкі. Адзін з іх схапіў вядро з півонямі, а другі скраў чатыры ружы ў другой прадаўшчыцы. Затым зладзюжкі пайшлі ў бок вуліцы Свярдлова, дзе аднаго з падазраваных затрымалі міліцыянеры, а другі ўцёк. Праз гадзіну месца жыхарства апошняга было ўстаноўлена і другога хлопца таксама затрымалі і даставілі разам з першым у РУУС. Маладыя людзі былі нападпітку. Як растлумачыў адзін з фігурантаў, яму не спадабалася занадта высокая цана на кветкі. За грабеж хлопцы могуць атрымаць абмежаванне волі на тэрмін да пяці гадоў ці пазбаўленне волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Цыгарэты трапілі пад арышт

Вялікая партыя тытунёвых вырабаў Гродзенскай фабрыкі «Нёман» была знойдзена ў багажніку аўтамабіля «Шкода-Актавія» нідзе не працуючага 28-гадовага жыхара Расійскай Федэрацыі. Яго аўто супрацоўнікі фінансавай міліцыі і ДАІ спынілі на трасе Масква—Івацэвічы падчас правядзення сумесных кантрольных мерапрыемстваў.

— Пры праверцы расіянін не змог прад'явіць дакументы на набыццё 3 500 пачак цыгарэт на агульную суму 3,7 тысячы рублёў, і тавар быў канфіскаваны, — паведаміў **начальнік Крычаўскага міжраённага аддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці Сяргей АЗАРАНКА.**

Маладому чалавеку пагражае адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй або без канфіскацыі тавару, згодна з часткай 1 артыкула 12.27 КаАП Рэспублікі Беларусь.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# ЗАРЭГІСТРАВАНЫ — ПЛАЦІ

## Па зацверджаных нарматывах утварэння адходаў

**Гэта гісторыя нагадвае сапраўдную жыццёвую і камунальную санта-барбару. Ну, уявіце сабе. У рэдакцыю з просьбай аб дапамозе звяртаецца заяўніца. Просіць яна за іншых людзей — сваіх родзічаў. Апошнім у спадчыну ў аграгарадку дастаўся дом. Уласнік жылля нядаўна пайшоў з гэтага жыцця. Яго дачка некалькі гадоў таму пераехала на іншае месца жыхарства. У доме зарэгістраваны іншыя родныя як самой нашай заяўніцы, так і ранейшага гаспадара дома. Зарэгістраваны, але фактычна пражываюць па іншым адрасе ў тым жа аграгарадку. Але тое жыллё яшчэ не ўведзена ў эксплуатацыю. У заяўніцы, якая, нагадаем, просіць за сваіх родных, а сама пражывае зусім у іншым месцы, узніклі прэтэнзіі па ўнясенні платы за абыходжанне з цвёрдымі камунальнымі адходамі. Маўляў, ніякага дагавора з людзьмі, што атрымалі ў спадчыну нерухомасць, не заключалася. Адпаведна, у іх пытанне: а на якой падставе яны павінны плаціць? Хоць, паколькі іх дом, дзе яны фактычна пражываюць, не ўведзены ў эксплуатацыю, па тым адрасе жыхары аграгарадка таксама гэтую паслугу не аплачваюць. Заўважым, ва ўсіх фігурантаў розныя прозвішчы. Як вам гісторыя?**

Таму, каб не памыліцца з імёнамі, ступенню сваяцтва і адрасамі рэгістрацыі і фактычнага пражывання ўсіх родзічаў і нікога не пакрыўдзіць гэтым, мы вырашылі апусціць вышэйназваныя звесткі. Пяройдзем адразу да праблемы.

На адрас размяшчэння атрыманай вяскоўцамі маёмасці на імя з'ехаўшай даўно дачкі гаспадара жылля прыйшло паведамленне аб аплаце запазычанасці за вываз цвёрдых камунальных адходаў. Было тое двойчы з невялікай розніцай у сакавіку. Фігуранты гісторыі не пагадзіліся з дакументам, матывуючы сваё рашэнне тым, што не ўступілі ў правы спадчыны (ды і ўвогуле, па словах заяўніцы, хочуць ад яе адмовіцца). Па стане на канец мая сума запазычанасці склала крыху больш за 42 рублі, у тым ліку пеня — больш за 23 рублі. Усе ўдзельнікі адмаўляюцца плаціць гэтыя грошы, збіраюцца падаваць у суд і ўвогуле — хацелі б закрыцця асабовага рахунку. Па словах заяўніцы, яны звярталіся да камунальнікаў, але станоўчага рашэння для сябе не дабіліся. Жанчына патэлефанавала ў газету...

Гэта гісторыя аб налічэнні платы за абыходжанне з цвёрдымі камунальнымі адходамі аказалася на слыху ў спецыялістаў камунальнага ўнітарнага шматгаліновага вытворчага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Ганцавіцкая РЖКГ» — дастаткова было толькі пачаць пераказваць яе сутнасць. У выніку мы атрымалі афіцыйны адказ наступнага зместу, які прыводзім з неабходнымі каментарыямі.

«Плата за абыходжанне з цвёрдымі камунальнымі адходамі разлічваецца па субсідзіруемых тарыфах для насельніцтва зыходзячы з нарматыву ўтварэння цвёрдых камунальных адходаў, устаноўленага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, і колькасці зарэгістраваных па месцы жыхарства грамадзян». (У гэтых сказах — адказ на пасаж заяўніцы, што адходаў у домаўладанні не магло быць. Любы паход у краму зараз не абыходзіцца без набыцця з патрэбнымі таварамі шкла, пластыку, цэлафану і г. д. Таму і існуе нарматыў утварэння адходаў. Пра колькасць зарэгістраваных па месцы жыхарства грамадзян таксама ў адказе сказана недвухсэнсоўна. — **Аўт.**).

«Такім чынам, па доме... (які застаўся ў спадчыну. — **Аўт.**) аграгарадка... адбываецца налічэнне за паслугу па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі на зарэгістраваных па месцы жыхарства грамадзян...

Асабовы рахунак па вышэйназваным адрасе быў афармлены на... (дачку, якая з'ехала некалі на іншае месца жыхарства. — **Аўт.**) згодна са спісамі грамадзян... сельскага Савета. З 1 чэрвеня 2018 года на падставе даведкі ад 11.06.2018 г. № 295, выдадзенай... сельскім выканаўчым камітэтам, уласнік жылога дома будзе зменены на... (памерлага гаспадара. — **Аўт.**), але сума налічэння па камунальных адходах не зменіцца, паколькі налічэнне праводзілася на двух зарэгістраваных па месцы жыхарства чалавек».

У канцы адказу фігурантам гісторыі прапануецца ў выпадку нязгоды з вышэйпададзеным абскардзіць яго ў абласной жыллёва-камунальнай арганізацыі.

Што датычыцца сумы, з-за якой узнікла спрэчка, дык, як удакладнілі нам камунальныя спецыялісты, пасля ўнясення заяўніцай колькі часу таму 20 рублёў яна складае: па асноўным доўгу — 21,87 рубля, пеня — 24,75 рубля.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КУПІСК ЭСТАФЕТУ ПРЫНЯЎ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




У Купіску трыццаць два гады таму пачынаў сваю працоўную дзейнасць у якасці начальніка ўчастка калгаса цяперашні старшыня Любчанскага пасялковага Савета Іван Ярмоц. Кіраўнік Савета прыгадвае, што гэтая вёска стала для яго другой радзімай (сам ён з Драгічынскага раёна), ведае кожнага з жыхароў, з многімі шчыраваў на палетках і калгасных фермах. Ён не хавае свайго задавальнення ад таго, што ў Купіску свята.

— Жыхары адказна падрыхтаваліся да гэтага дня, навялі парадак у дварах і на вуліцы, упрыгожылі сцэны дамоў і пасадзілі кветкі і, вядома, удзельнічалі ў конкурсе на найлепшую прэзентацыю свайго падвор'я, — кажа Іван Ярмоц. — А Савет паклапаціўся зрабіць падарунак — да свята была асфальтавана галоўная дарога да населенага пункта.





Вядома, якое свята без канцэрта, без гучных слоў у адрас найлепшых працаўнікоў і добрасумленных людзей, якімі ганарыцца ўся вёска. Удзельнікамі свята сталі і былыя жыхары Купіска, якія стала жывуць у райцэнтры, суседніх гарадах, у абласным цэнтры, а таксама ў сталіцы, але якія не забылі пра гэты дзень і прыехалі на сваю малую — мілую і дарагую — радзіму.

На гэтых здымках можна ўбачыць, як святкуюць дзень вёскі ў Купіску. Але больш здымкаў з гэтай падзеі глядзіце на нашым сайце: zviazda.by.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

# НА ЎСЯКІ ВЫПАДАК

## Палачка-выручалачка ў дзеянні

Але не будзем пра сумнае. Дзякуючы развіццю сістэме страхавання кожны ў стане мінімізаваць наступствы няштатных сітуацый у дачыненні да самога сябе, сваіх родных і блізкіх. Летась было аформлена больш чым паўтара мільёна полісаў добраахвотнага страхавання ад няшчасных выпадкаў і захворванняў на час знаходжання за межамі Беларусі. На які ж памер кампенсацыі сваіх выдаткаў можа спадзявацца чалавек, трапіўшы дзе-небудзь у Парыжы на бальнічны ложак?

— Усё залежыць ад сітуацыі, — расказвае **начальнік упраўлення медыцынскага страхавання кампаніі «Белдзяржстрах» Людміла КУЛАК.** — У нашай кампаніі стандартная страхоўка для турыста, які накіроўваецца, напрыклад, на два тыдні ў краіну Шэнгенскай зоны, разлічана на аказанне яму медыцынскай дапамогі ў памеры не больш за 30 тысяч еўра. Каб набыць у нас такі поліс, кліенту трэба заплаціць 4—7 еўра. Але ён павінен ведаць, што страхоўка дзейнічае толькі тады, калі ёсць рэальная пагроза яго здароўю або жыццю. Дарэчы, пры набыцці поліса трэба ўважліва чытаць, у якіх канкрэтна выпадках ён з'явіцца палачкай-выручалачкай. У кожнай страхавой арганізацыі, а іх у Беларусі 17, свае ўмовы і прынцыпы.

**— Якія страхавыя выпадкі за мяжой здараюцца часцей за ўсё?**

— У асноўным гэта беды курортнікаў, асабліва дзяцей. Тут і ўсялякія ротавірусныя інфекцыі, і запаленне кішэчніка, і іншыя захворванні, звязаныя з харчаваннем. Плюс прастуда, ангіна, моцныя ўдары, парэзы, што патрабуюць неадкладнага ўмяшальніцтва медыкаў. Зразумела, трэба быць гатовым да ўсяго. Вось нядаўна ў Аўстрыі ў нашага суайчынніка здарыўся інфаркт міякарда. Спатрэбілася транспартаванне хворага ў спецыялізаваную клініку, дзе ён знаходзіўся шэсць сутак. Расходы склалі 14 тысяч еўра. Добра, што чалавек быў застрахаваны.

А што рабіць таму гаротніку, які рызыкнуў накіравацца ў далёкае замежжа без страхоўкі? Ды яшчэ не маючы ў кішэнях дастатковай колькасці валюты. Вядома, калі што, замежныя ўрачы не пакінуць небараку паміраць, выратуюць. Але потым дашлюць рахунак на хатні адрас. Не заплаціш — унясуць у чорны спіс людзей, якім уезд у пэўную дзяржаву (або нават дзяржаў, калі яны ўваходзяць у Шэнген), будзе забаронены. І тут яшчэ наш няўдачлівы зямляк хай скажа дзякуй. Улады некаторых краін наогул не выпускаюць неплацельшчыкаў, пакуль тыя не дастануць грошы.

## Перш за ўсё — здароўе

Наслухаўшыся пра такія прыгоды, некаторыя беларусы ні за якія пернікі не хочуць пакідаць межы роднай краіны. Аднак і седзячы ў хаце немагчыма застаherвацца ў поўнай бяспецы. Таму асабістае страхаванне, нават калі яно і не звязанае з выездам за кардон, усё роўна набірае абароты.

— Гэта тэндэнцыя сведчыць аб тым, што псіхалогія людзей прыкметна змянілася, — гаворыць Людміла Кулак. — Калі раней яны пераважна турбаваліся аб тым, як засцерагчы маёмасць, то цяпер на першы план выходзіць здароўе.

Апошнім часам у Беларусі амаль утрая павялічыліся ўзносы па страхаванні жыцця, яшчэ больш — па страхаванні медыцынскіх расходаў. Летась адзін толькі «Белдзяржстрах» зрабіў каля 40 тысяч выплат у кошт кампенсацыі затрат грамадзян на лячэнне.

— Страхаванне чалавека, звязанае з рызыкай для яго жыцця, — працягвае Людміла Аркадзеўна, — адзін з самых складаных кірункаў у нашай рабоце. Некаторыя патрабуюць застрахаваць сябе на мільёны. Тады мы тлумачым, што не можам даць згоду на прапануемую здзелку. Бо па ўмовах кампаніі тарыф пры такіх аперацыях не больш за 1,5 працэнта ад страхавой сумы ў год. Хоць былі выпадкі, калі страхавалі чалавека на 100 тысяч долараў. Аднак у такіх сітуацыях патрабавалі ад кліента дадатковыя пакеты дакументаў, у тым ліку гісторыю яго захворванняў. Словам, падобныя пагадненні — рэч надзвычай складаная і таму рэдкая.

Звычайна жыццё страхуецца на куды больш сціплую суму. Часта яна не перавышае дзвюх тысяч рублёў. У выпадку траўмы, захворвання або іншага няшчаснага выпадку спецыялісты арганізацыі высвятляюць усе яго дэталі і назначаюць памер кампенсацыі для свайго падшэфнага. Калі вы зламалі нагу, то гэта сума можа даходзіць працэнтаў да 30 ад страхавой. Зламаны палец пацягне працэнтаў на пяць, а то і менш. На поўную страхоўку можна разлічваць толькі пры крайніх абставінах — інваліднасць першай групы або лятальны фінал.

## Мой дом — мая крэпасць

Калі ацаніць жыццё чалавека даволі складана, бо яно з'яўляецца катэгорыяй нематэрыяльнай, то вызначыць кошт той ці іншай рэчы заўсёды можна без асаблівага напружання.

Вядома, больш за ўсё кожны перажывае за жыллё. Калі вы валодаеце асобным домам, то па беларускім заканадаўстве павінны яго застрахаваць. Але абавязковая страхоўка забяспечвае абарону толькі 50 працэнтаў кошту будынка. І ў выпадку яго разбурэння, напрыклад, ураганам або знішчэння пры пажары вы зможаце дабіцца толькі палавіннага пакрыцця ўрону. Каб ён быў кампенсаваны цалкам, неабходна ў добраахвотным парадку афарміць страхаванне астатняй паловы жытла. Важна адзначыць, што пры абавязковым страхаванні яго дзеянне распаўсюджваецца толькі на жылы будынак. Пуні, лазні, гаражы, летняя кухні, платы не трапляюць пад «парасон бяспекі». Каб не згубіць у выпадку стыхійнага бедства ўсё гэта багацце незваротна, трэба аформіць на яго добраахвотны поліс. Пры гэтым уладальнік застрахуе свае будынкі не толькі ад стыхіі, але і ад такіх нечаканасцяў, як наезд аўтамабіля, падзенне дрэва ці самалёта, набег дзікага звера і нават буянства якога-небудзь дэбашыра.

— За апошнія некалькі гадоў аб'ёмы грашовых узносаў па гэтым відзе страхавання павялічыліся ў пяць разоў, — дзеліцца інфармацыяй **намеснік начальніка ўпраўлення маёмасных інтарэсаў грамадзян «Белдзяржстраха» Алена КУЦЭВІЧ.** — На цяперашні момант толькі адна наша кампанія мае 700 тысяч такіх пагадненняў з кліентамі. Згодна са статыстыкай, 80 працэнтаў выплат выпадае на стыхійныя бедствы, 10 — на пажары, 7 — на неправамерныя дзеянні трэціх асоб.

З жыхарамі шматкватэрных дамоў работа пастаўлена крыху інакш. Ім прапануецца добраахвотнае комплекснае страхаванне жылля. Гэта значыць разам з кватэрай ад розных аварый страхуецца ўсё, што ў ёй знаходзіцца. А таксама адказнасць гаспадароў у выпадку нанясення якога-небудзь ненаўмыснага ўрону суседзям. Сярод гараджан такая форма абароны сваёй маёмасці найбольш папулярная. Аб гэтым сведчыць той факт, што такім спосабам у краіне застрахаваная ўжо кожная пятая кватэра.

## Самая экзатычная кліентура

У апошнія гады аматары дамашніх чатырохногіх усё больш актыўна страхуюць сваіх гадаванцаў. Прычым гэта характэрна як для горада, так і для вёскі. Але на сяле асобай павагай з боку клапатлівых гаспадароў карыстаецца некалькі іншы кантынгент жывёльнага свету. Тут ў фаворы коні, каровы, свінні, козы, авечкі — словам тыя, хто прымае самы актыўны ўдзел у вядзенні хатняй гаспадаркі. Ім і дастаюцца страхавыя полісы. А як інакш? Згубіць, напрыклад, каня, ды яшчэ ў сезон аўральнай работы, для іншага селяніна — бяда. А застрахаваўшы жывёліну, ён у выпадку яе гібелі не застанецца без падтрымкі.

— Вось нядаўна, — успамінае Алена Куцэвіч, — у Лідскім раёне ў выніку траўмы загінула карова. Яна была застрахаваная на 1600 рублёў. Роўна столькі і атрымаў гаспадар у якасці кампенсацыі.

## Ці тое яшчэ будзе

Летась аб'ём страхавых узносаў у Беларусі істотна перавысіў мільярд рублёў. Гэтаму паспрыяў цэлы шэраг фактараў, адзін з якіх — пашырэнне відаў паслуг. Напрыклад, з нядаўняга часу з'явілася магчымасць страхаваць мабільныя тэлефоны. Як ад крадзяжу, так і ад пашкоджання.

Набірае папулярнасць таксама добраахвотнае страхаванне бяспекі веласіпедыстаў. Набыты поліс з'яўляецца падстрахоўкай і для ездака, і для яго транспартнага сродку. Адначасова страхуецца яшчэ і магчымая адказнасць велаўладальніка ў выпадку нанясення ўрону здароўю іншых людзей або іх маёмасці.

Хутчэй за ўсё ўжо сёлета адбудуцца новаўвядзенні ў сектары страхавання жыцця і дадатковых пенсій. Чакаем і іншых прапаноў.

**Міхаіл КАВАЛЁЎ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сямейная газета
Выпуск № 11 (102)

# ФУТБОЛ І ІНШЫЯ НЕПРЫЕМНАСЦІ

Ну вось, пачалося! Сёння ў кожнай хаце, дзе ёсць хоць адзін заўзятар футбола, — свята. І так да пачатку ліпеня, пакуль мундзіяль-2018 не стане гісторыяй.

Свята, праўда, не для ўсіх — для тых, хто футболам не цікавіцца ўвогуле і лічыць, што гэта проста дваццаць тры лайдакі (дваццаць трэці — суддзя) гойсаюць адзін за адным па полі, ганяючы мяч, падстаў радавацца асабліва няма. Не сакрэт, што большасць такіх вось спартыўна несвядомых таварышаў — замужнія жанчыны, і, калі паглядзець на чэмпіянат свету па футболе іх вачыма, сітуацыя выглядае прыкладна так. «Дома процьма работы, а мой сядзіць перад тэлевізарам і нічога, акрамя свайго футбола, не бачыць і бачыць не хоча. Замест таго, каб з дзецьмі заняцца (варыянты: траву пакасіць, паліцу прыбіць, вады прынесці і г. д.), ён будзе дзве гадзіны запар глядзець, хто выйграе — Егіпет ці Саудаўская Аравія. Гэткія самыя футбалісты, як і ён! Каб, дай бог, гэты тэлевізар сапсаваўся! Але не, да суседа пойдзе, яшчэ і піва там нажлукціцца. Вось каб якая маланка ў якую вышку шаснула, каб паказваць зусім перастала!..»

Палова ж, якая сядзіць перад тэлевізарам, думае прыблізна наступнае: «Адна з нямногіх радасцяў у гэтым жыцці — футбол паглядзець — і таго зрабіць па-людску не даюць. Яна пакуль маўчыць, але ходзіць па хаце з такой кіслай мінай, так посудам на кухні барабаніць, што нешта зараз абавязкова выдасць. А тут такі цікавы матч — Егіпет з Саудаўскай Аравіяй гуляе — арабы з арабамі, калі яшчэ такое ўбачыш. Можа, да суседа халастога пайсці, там спакойна паглядзець? Але ж тады ўвогуле немцы ў хаце будуць. Ды і што я, ужо ў сваёй хаце не гаспадар? Хай толькі паспрабуе што мне сказаць!..»

А сёлета зусім бяда: матчы развялі па гарадах вялізнай краіны, якія знаходзяцца ў розных часавых паясах. Таму пад дэвізам «але-але-але» аматары футбола і іх незадаволеныя палавіны будуць жыць цэлымі днямі — матч з Казані будзе трансляваецца ў 13.00 па нашым часе, а гульня, якая ў той жа дзень пройдзе ў Калінінградзе, — у 22.00. Карацей, нясумна будзе ўсім...

І будуць у гэтага мундзіяля, як і, напэўна, ва ўсіх папярэдніх, свае ахвяры — узаемна пакрыўджаныя, зняважаныя, крый божа, яшчэ і пабітыя, і як вынік — на мяжы або ў працэсе разводу. У Ізраілі, напрыклад, да гэтага дайшло яшчэ да пачатку чэмпіянату: жонка выгнала мужа да бацькоў. Справа ў тым, што заўзятар перад сусветным першынством купіў аж чатыры тэлевізары (пэўна, дзеля таго, каб назіраць у рэжыме рэальнага часу за матчамі, якія праходзяць адначасова). Жанчыне не спадабалася такое марнатраўства, да таго ж, яна заявіла, што не хоча, каб яе жытло ператваралася ў шумны мужчынскі клуб, і папярэдзіла, што, калі муж не з'едзе на час чэмпіянату да бацькоў, яна прымусіць яго зрабіць гэта праз суд...

Карацей, барацьба, як у тым футболе, — тут табе і стратэгія, і тактыка, і гульнявое майстэрства. Толькі вось у выніку ніхто з «фіналістаў» не стане пераможцам. Хіба што... Аднойчы ён скажа: «Сядзь са мной, адпачні, паглядзі, як цікава». І пакладзе руку ёй на плячо. А яна, прысеўшы, раптам зразумее, што глядзець гэта можна — хоць бы таму, што на экране бегаюць дваццаць тры здаровыя падцягнутыя мужчыны, а побач сядзіць свой, можа, не такі падцягнуты, але ж родны і дарагі...

На футбольнай мове гэта завецца «Гуляць у адной камандзе». Што вам і жадае рабіць заўжды

**Ваша «Сямейная газета».**

■ Зорны тата

# «Я БЫЎ ЗА ЖОНКАМІ ЯК ЗА КАМЕННАЙ СЦЯНОЙ»

## Гумарыст Яўген Крыжаноўскі пра сям'ю, халасцякоў, дзіцячыя перадачы і серыялы



Вядомы гумарыст у акружэнні сваіх жанчын.

**Ранкам у будны дзень Яўгена КРЫЖАНОЎСКАГА можна застаць на дзіцячай кінастудыі. Месца, дзе ствараецца праграма «Гумарынка», — гэта ўсяго тры пакоі над Музеем прыроды. «Мы, дарэчы, збіраемся падаць заяўку ў Кнігу рэкордаў Гінеса як самая маленькая кінастудыя», — дзеліцца артыст. Ён, як заўсёды, у касцюме і чырвоным гальштуку. Усміхаючыся, кажа, што толькі аднойчы прыехаў на работу ў шортах (не паспеў пераадзецца пасля лецішча), — дзеці былі ў шоку.**

**Яўген расказаў нам, хто падказвае сюжэты для «Гумарынкі», як застаецца ў добрых адносінах з пяццю жонкамі, чым можна ўтрымаць мужчыну ў сям'і і чаму Крыжаноўскія не купляюць посуд.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Рамантычны эксперымент

# ДЗЕ ВЫ, МУЖЧЫНЫ?

## У Мінску ладзяць экспрэс-спатканні для пажылых

**Фармат хуткіх спатканняў папулярны ў моладзі. А як такі спосаб знаёмстваў успрымуць пажылыя? Гэта вырашылі праверыць у сталічным Цэнтры актыўнага даўгалецця.**

Хуткія спатканні арганізавалі, бо з боку аўдыторыі быў запыт на падобныя мерапрыемствы.

— Нам спадарыні званілі і казалі: давайце ладзіць вечары сустрэч, — успамінае **намеснік дырэктара цэнтра Алена МАРЫГЕРОЎСКАЯ.** — Для іх гэта важна, бо з узростам адзінота асабліва «душыць».

На першае мерапрыемства быў адкрыты папярэдні запіс. Ліміт — 20 чалавек. А запісалася ажно 60 ахвотных! Праўда, мужчын з іх было ўсяго чатыры. Таму ў выніку на сустрэчу запрасілі 12 чалавек, каб кожнай жанчыне хапіла ўвагі ад дужага полу. Узрост удзельнікаў быў ад 55 да 75 гадоў. У анкетах трэба было пазначыць чаканні ад мерапрыемства. Жанчыны ў асноўным пісалі, што хочуць знайсці пару, а мужчыны — цікава правесці час.

— Калі б вы бачылі, якія жанчыны прыгожыя прыйшлі! Яны з раніцы збіраліся, макіяж зрабілі, на прычоску ў цырульню запісаліся, прынеслі шпількі. А мужчыны былі ў касцюмах, — расказвае Алена Марыгероўская.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*



■ Абмяркуем?

# НЕ ТРАПІЦЬ У «ЯМУ»

## Матэрыяльныя ўмовы для традыцыйнай сям'і ў Беларусі створаны. Спецыялісты лічаць — не хапае духоўных

**Некалькі гадоў таму «дэмаграфічныя нажніцы» ў нашай краіне практычна самкнуліся. У 2015 годзе нарадзілася 119 тысяч дзяцей — рэкордная колькасць за ўсю гісторыю існавання суверэннай Беларусі. Але ўжо летась народжаных было меней, чым памерлых, на 13 %. І сітуацыя працягвае заставацца напружанай. У Беларусі шмат робіцца для таго, каб ствараліся сем'і, паляпшалася дэмаграфічная абстаноўка, але гэта не заўсёды дае свой плён. Чаму?**

### АД ПАТРЫЯРХАТУ ДА МАТРЫЯРХАТУ

Наогул, за апошнія 100 гадоў паняцце «сям'я» вельмі трансфармавалася. Ад патрыярхальнага ўкладу, дзе бясспрэчным лідарам сямейства быў мужчына, перайшлі да новай мадэлі — матрыярхальнай. Жанчыны самі вінаваты. Навошта было ўраўноўваць сябе з мужчынамі ў правах? Займаліся б дзецьмі, вышывалі крыжыкам, гатавалі смачныя абеды і не думалі б пра пенсію. Сёння хатнюю гаспадарку прыходзіцца сумяшчаць са сваімі прафесійнымі абавязкамі, і дужая палова не заўсёды імкнецца падставіць надзейнае плячо. Думаеце, нагаворваю? Мяркуйце самі.

— Нявесты сёння больш самастойныя, моцныя, — дае ацэнку мясцовым маладажонам **начальнік загса Магілёўскага гарвыканкама Галіна АНОШКА.** — У 90 працэнтах са 100 яны дыктуюць мужчынам, што і як трэба рабіць. І толькі ў 10 % сем'яў мужчына застаецца галавой. Жанчыны больш маладыя і больш адукаваныя, чым іх жаніхі. Большасць з іх працуе, у той час як іх абраннікі знаходзяцца ў пошуках працоўнага месца.

Не факт, што ў тым далёкім «патрыярхальным» мінулым усе сем'і былі аднолькава шчаслівыя, але ж разводаў амаль не здаралася. Насамрэч, што б жанчына рабіла без мужчыны? Ён жа быў карміцельцам. Сёння гэта неактуальна, як і адзін шлюб на ўсё жыццё. Развесціся можна ўжо на наступны дзень.

### «У МЯНЕ СЯСТРЫЧКІ НЯМА, У МЯНЕ БРАЦІКА НЯМА...»

На сённяшні дзень у Беларусі існуе 11 відаў дзяржаўных дапамог. За нараджэнне трэцяга і кожнага наступнага дзіцяці можна атрымаць сямейны капітал, эквівалентны 10 тысячам долараў ЗША. Шэраг сем'яў карыстаецца льготамі, атрымлівае адрасныя дапамогі, субсідыі пры будаўніцтве жылля. Што яшчэ трэба?

Стварайце сем'і і карыстайцеся! На жаль, моладзь не спяшаецца. Па інфармацыі магілёўскага загса, сярэдні ўзрост жаніхоў, якія звярталіся сюды летась, дасягаў 29,5 года, нявест — 28. Яшчэ пяць гадоў таму лічбы былі іншымі: 26,5 і 25 адпаведна.

Але нават у гэтым амаль 30-гадовым узросце маладажоны застаюцца, мякка кажучы, дзецьмі.

— Нашы псіхолагі б'юць трывогу, што маладыя бацькі не ведаюць, як паводзіць сябе з нованароджаным дзецьмі, — сведчыць **намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай абароны Ленінскага раёна Магілёва Марыя МАХУНОВА.** — Яны яшчэ самі толкам не змаглі арганізаваць сямейнае жыццё, а ўжо павінны выхоўваць кагосьці трэцяга. Яшчэ горш, калі маладая сям'я жыве з бацькамі, дзядулямі і бабулямі. Атрымліваецца, што старэйшыя бяруць пад сваю апеку і дзяцей, і ўнукаў, тым самым пазбаўляючы іх адказнасці. Няма разумення, што створана новая ячэйка грамадства. Потым пачынаюцца праблемы, разводы, гвалт...

Кажуць, калі да сарака гадоў у доме не пасяліліся дзеці, там паселіцца адзінота. Але сёння бацькоўскія пачуцці можна перажыць практычна ў любым узросце. Да паслуг сурагатнае мацярынства, дзеці з прабіркі. І зоркі гэтым актыўна карыстаюцца. Ні пол, ні ўзрост ім не перашкода.

— Мне ўсё часцей прыходзіцца сутыкацца з неразуменнем моладзі, чаму сям'я — гэта толькі мужчына і жанчына. І гэта ўжо не жарты, — канстатуе **метадыст і лектар перасоўных выставак, педагог Алена ЯРАШЭВІЧ.** — Памятаю, як адна дзяўчына не магла пагадзіцца з тым, што саюз мужчыны і мужчыны — гэта ненармальна. І пераканаць яе было немагчыма.

### У ЧЫМ ПРАБЛЕМА?

Парадокс: у Беларусі існуе імідж шматдзетнай сям'і, але пры гэтым цнатлівасць у маладзёжным асяроддзі ўспрымаецца як прыкмета ненармальнасці. Кантрацэптывы можна купіць дзе пажадаем, у тым ліку ў прадуктовай краме. Пасведчанне аб шлюбе ўсё роўна не папросяць. Пазашлюбныя адносіны, магчыма, дапамогуць зняць стрэс, але наўрад ці прынясуць шчасце. Бо першапачаткова будуюцца зусім на іншых інтарэсах.

— Некаторыя мастацкія фільмы, выступленні, якія маскіруюць адмаўленне сям'і і дэманструюць перавагі іншага жыцця, наносяць адчувальную шкоду грамадству, — лічыць **дэпутат камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандр СТАРАВОЙТАЎ.** — У мяне трое дзяцей. Моцная сям'я, якая яднае дзяцей, бацькоў, бабуль, дзядуль, з'яўляецца асновай шчасця і доўгажыхарства.

Сям'я перш за ўсё — гэта маленькая дзяржава са сваімі патрабаваннямі і абавязкамі. І трымаецца яна на аўтарытэце бацькоў. Сёння існуе шмат розных меркаванняў наконт ювенальнай юстыцыі, прынцыпы якой могуць з'явіцца і ў заканадаўстве Беларусі.

— Будзе цалкам знішчаны працэс выхавання. Праз 15 гадоў мы атрымаем пакаленне някіраваных маладых людзей, якія будуць не проста эгацэнтрычныя, а наогул не пажадаюць прызнаваць іншага меркавання, акрамя свайго. У выніку гэта прывядзе да скарачэння насельніцтва. «Новыя» людзі не будуць нараджаць, паколькі караць дзіця нельга, а як выхоўваць яго — невядома. Дэмаграфічная яма стане бяздонню. Мы атрымаем тое, што зараз адбываецца ў Еўропе. Поўнае знікненне нацыі, — перасцерагае **дырэктар дабрачыннага фонду «Адкрытыя сэрцы» Уладзіслаў ВАЛАХОВІЧ.**

— Абвяшчэнне гендарнай ідэалогіі ставіць пад пытанне саюз мужчыны і жанчыны, а ўзаконьванне прынцыпу прыярытэтнасці правоў дзіцяці над правамі дарослых робіць немагчымым правільнае выхаванне дзяцей у сям'і, — аргументуе **архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі ўладыка Сафроній.**

### ЯК РАТАВАЦЬ СЯМ'Ю

Заклапочанасць будучыняй традыцыйнай беларускай сям'і сабрала нядаўна ў Магілёўскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы ўсіх тых, каму не абыякавая гэта праблема. Ініцыятарам круглага стала «Моцная сям'я — моцная дзяржава» стала Магілёўская епархія Беларускай праваслаўнай царквы. Сваімі думкамі наконт пагроз для будучыні сям'і дзяліліся педагогі, дзяржаўныя служачыя, народныя абраннікі, прадстаўнікі розных канфесій, грамадскія дзеячы, якія прыехалі ў Магілёў з усіх абласцей.

**Кіраўнік Цэнтра абароны мацярынства і сямейных каштоўнасцяў іерэй Уладзімір КОТАЎ** лічыць, што прыйшла пара зафіксаваць паняцці «бацька», «маці», «сям'я» на ўзроўні заканадаўчай базы. Каб не было іх двухсэнсоўных трактовак.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Фота носіць ілюстрацыйны характар.**

— Аднойчы я выступаў у маладзёжнай аўдыторыі і мяне спыталі, чаму царква асуджае нетрадыцыйныя адносіны людзей, што дрэннага ў тым, што мужчына кахае мужчыну. Я адказаў: мы жывём на гэтай зямлі толькі дзякуючы таму, што нарадзіліся ў традыцыйнай сям'і і нашы маці не зрабілі аборт, — кажа клірык.

Шмат было сказана і пра тое, што ў Беларусі не хапае спецыяльнага кантэнту для павышэння прэстыжу традыцыйнай сям'і, некаторыя відэа і аўдыяматэрыялы ставяць пад сумненне сямейныя каштоўнасці, няма тэлесерыялаў і шоу-праграм, дзе б прысутнічаў вопыт пераадольвання цяжкіх жыццёвых сітуацый.

— У нашай арганізацыі ёсць прытулак і перадабортнае кансультаванне, і мы, пасля стасункаў з жанчынамі, якія да нас звярнуліся, упэўніваемся, што дзяржава добра падтрымлівае сем'і на матэрыяльным узроўні, але не здольная дапамагчы ў крызісных сітуацыях. У нас, на жаль, няма мадэляў іх пераадолення, — кажа **Вераніка СЯРДЗЮК, старшыня Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля».** — У нас рэгіструюць шлюбы, разводы, але нічога не робяць, каб навучыць маладую сям'ю спраўляцца з праблемамі.

Па выніках сустрэчы быў створаны каардынацыйны савет, які выпрацаваў шэраг пазіцый па захаванні інтарэсаў галоўнай ячэйкі грамадства. Сярод іх прапанова распрацаваць дзяржпраграму падрыхтоўкі моладзі да сямейнага жыцця і асобна для ўстаноў адукацыі, павялічыць колькасць мастацкіх і мультыплікацыйных фільмаў, а таксама культурных праграм, прысвечаных папулярызацыі прэстыжу сям'і і дзеталюбства, на заканадаўчым узроўні замацаваць выхаванне дзяцей у шматдзетных сем'ях як форму працоўнай дзейнасці, умацаваць гарантыі бацькоўскіх правоў на выхаванне дзяцей і абмежаваць празмернае ўмяшанне ва ўнутраныя справы сям'і органаў апекі, шырока інфармаваць насельніцтва наконт шкоды абортаў для здароўя жанчыны і бесчалавечнасці забойства новага жыцця на ранніх этапах яго з'яўлення. Прапануецца таксама распрацаваць Кодэкс сямейных каштоўнасцяў, дзе будуць раскладзены па палічках усе тыя паняцці, якія садзейнічаюць умацаванню саюза мужчыны і жанчыны, а таксама захаванню духоўна-маральных каштоўнасцяў і павышэнню ролі бацькоў у сям'і. Акрамя гэтага, звяртаецца ўвага на тое, што некаторыя паняцці і фармулёўкі скажаюцца, а гэта недапушчальна пры выхаванні здаровага грамадства. Напрыклад, грамадзянскі шлюб — гэта афіцыйны саюз, таму не трэба прыкрываць ім пазашлюбную сувязь. Трэба ўсё выразна называць сваімі імёнамі. Тады не будзе ніякай двухсэнсоўнасці. З гэтымі і іншымі прапановамі каардынацыйны савет мае намер звяртацца ў вышэйшыя структуры ўлады.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ДЗЕ ВЫ, МУЖЧЫНЫ?

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

Сустрэча праходзіла восьу якім фармаце. Спачатку ўдзельнікі прэзентавалі сябе. Потым малявалі: ім прапанавалі адлюстраваць, як яны ўяўляюць тэму кахання. Была запланавана таксама музычная паўза: адзін з мужчын аказаўся музыкантам і захацеў сыграць на гітары і выканаць бардаўскую песню. І вядома, самай цікавай часткай сталі непасрэдна хуткія спатканні: пажылыя садзіліся за столікі адно насупраць аднаго і за пару хвілін стараліся як мага больш даведацца пра свайго суразмоўніка. Атмасфера спрыяла рамантыцы: свечкі, кветкі, музыка...

— Бліскучыя, радасныя вочы — самы лепшы вынік, — упэўнена намеснік дырэктара цэнтра. — Увогуле, хацелася паглядзець, як старэйшая аўдыторыя ўспрыме эксперымент. Аказалася, яны вельмі адкрытыя для новага. Людзі сярэдняга ўзросту, мне здаецца, нават больш закрытыя.

У цэнтры запэўніваюць: хуткія спатканні будуць ладзіцца рэгулярна. Толькі трэба прыдумаць, як прыцягнуць да ўдзелу ў іх мужчын. Бо так атрымліваецца, што прадстаўнікі дужай паловы больш пасіўныя за жанчын. «Мы нават робім міні-даследаванне: дзе ёсць мужчыны? — усміхаецца суразмоўніца. — У спісе танцавальныя пляцоўкі, паркі адпачынку, дзе пенсіянеры гуляюць у даміно і шахматы, рыбалоўныя месцы. Вось куды трэба ехаць».

А яшчэ пазнаёміцца можна на занятках цэнтра: там якраз збіраюцца людзі з падобнымі інтарэсамі. Жанчыны, увага: мужчыны часцей запісваюцца на курсы па прамоўніцкім майстэрстве, камп'ютарнай адукаванасці і гімнастыцы «Белаяр».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

■ Востры вугал

# НЯВЫЗНАЧАНЫ СТАТУС

## Мужчына з ВІЧ хоча ўсынавіць дзіця, але закон не на яго баку



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**«Летам дачка збіраецца ў Еўропу, у госці да цёткі. Учора да мяне прыбегла, абняла: «Тата, я ад цябе нікуды не хачу з'язджаць». У мяне ажно сэрца ёкнула пасля гэтых слоў», — з пяшчотай расказвае Сяргей (усе імёны ў гісторыі зменены па просьбе героя. — Аўт.) пра сямігадовую Веру. Дзяўчынка яму не родная дачка. Яе біялагічнага бацькі няма ў жывых. Але сапраўдным татам яна лічыць Сяргея — таго, які прыглядае за ёй з акна дома, пакуль тая катаецца на роліках у двары, і купляе фіялетавых акуляры, бо ведае, што гэты колер — Верын любімы. З мамай дзяўчынкі мужчына разам пяць гадоў. Хоча з ёй ажаніцца, а малую афіцыйна ўдачарыць. Апошняе, праўда, зрабіць немагчыма: закон не дазваляе. У Сяргея ВІЧ, трэцяя стадыя, а такі дыягназ не дае права быць апекуном ці ўсынавіцелем.**

### «Вельмі хацелася сваіх дзяцей»

Сяргею за 30. Ён жыве ў адным з беларускіх раённых цэнтраў. Тут, як і ўсюды, на цэнтральнай плошчы стаіць помнік Леніну, а маршрутчыкі ведаюць пастаянных пасажыраў у твар.

Пры сустрэчы мужчына радасна дзеліцца побытавымі «перамогамі»: хутка скончыць рамонт у кватэры і пераедзе туды з сям'ёй.

— У дачкі пакой асобны будзе. Канапу раблю ёй на заказ. Колер сцен у пакоі серабрысты, а тахта будзе блакітная.

З Верай Сяргей пазнаёміўся, калі тая была зусім маленькая, амаль не размаўляла.

— Я прыглядаў за ёй, купаў, спаць укладваў. Я чужой яе не лічу. Вучу з Верай урокі, чытаю, гуляю, езджу на веласіпедзе. Часам бяру з сабой на работу (*Сяргей займаецца аўтамабілямі. —* **Аўт.**), — ёй цікава. Адным словам, паводжу сябе як усе звычайныя бацькі. Дачка Сяргеем мяне і не называла, адразу «татам». А свайго роднага бацьку — «тата Ігар».

Як удалося заваяваць прыхільнасць малой? Сяргей задумваецца. «Магчыма, таму, што сваіх дзяцей у мяне на той момант не было. А вельмі хацелася. Я адразу Веру палюбіў. У садку яна падарункі мне рабіла. На дзень нараджэння неяк малявала паштоўку, выразала каралікі і клеіла іх туды. Маёй маме таксама рыхтуе падарункі».

Мужчына тлумачыць: ён хоча ўдачарыць дзяўчынку, каб мець афіцыйныя падставы ўдзельнічаць у яе жыцці. «Я не магу бальнічны ўзяць, каб з дзіцем сядзець, не магу хадзіць у школу на сходы: бо хто я ёй?»

### «Маме пра дыягназ сказаў не адразу»

Пра дыягназ ВІЧ Сяргей даведаўся ў 2010 годзе. Трапіў за спажыванне наркотыкаў у калонію, дзе ў яго, як таго патрабуе інструкцыя, узялі аналізы і выявілі інфекцыю. Мужчына ўспамінае, што ніякіх сімптомаў у яго не было: не худзеў моцна, не хварэў.

Калі вызваліўся, Сяргей пайшоў да свайго раённага інфекцыяніста і паўторна праверыў імунны статус. Колькасць клетак CD4 у крыві (лімфацытаў, якія першымі атакуюць інфекцыі) была зніжанай.

— Мне паставілі трэцюю стадыю. Акрамя ВІЧ, у мяне на той момант было яшчэ адно захворванне — гепатыт С. Але другі дыягназ ужо знялі: я аддаў за курс таблетак каля тысячы долараў, але вылечыў гепатыт, — кажа мужчына.

Маме пра свой дыягназ ён паведаміў не адразу: хваляваўся ў першую чаргу за яе — мамы ўсё прымаюць блізка да сэрца. Бацька пра ВІЧ не ведае дагэтуль. Сяргей тлумачыць: тата не ўмее трымаць сакрэты, можа прагаварыцца ў кампаніі.

Як падсеў на наркотыкі, мужчына ўжо не памятае.

— Гэта было вельмі даўно, у школе напэўна. Хацеў вылучацца нечым. Першыя пяць-восем гадоў усё было ў парадку. Я мог сумяшчаць наркотыкі і вучобу. Потым сталі вылазіць праблемы. Змяніў кучу работ, абарваў кантакты з блізкімі, набраў крэдытаў...

Толькі пасля зняволення Сяргей зразумеў, што нешта ў яго жыцці ідзе не так.

— Ведаеш, чаму змяніўся? У мяне была тая стадыя, калі невыносна было жыць з наркотыкамі і невыносна без іх. Нічога не атрымлівалася. Адзінота накрывала.

Спроб кінуць было шмат. Рэабілітацыйныя цэнтры, бальніцы... Нічога не дапамагала. Выздараўлівац пачаў, толькі калі трапіў у суполку ананімных наркаманаў. Там Сяргей і пазнаёміўся з цяперашняй жанчынай. Яе былы муж меў праблемы з наркотыкамі — праз іх і памёр.

У будучай жонкі Сяргея таксама ВІЧ. Але дачка Вера, на шчасце, нарадзілася здаровай.

Мужчына прызнаецца: з яго мінулым знайсці працу было няпроста. Нідзе не бралі нават грузчыкам. Чаму — адкрыта ніхто не казаў, адмаўлялі без тлумачэння прычыны. Тады Сяргей вырашыў пачаць сваю справу. Успомніў, што некалі займаўся аўтамабілямі і яму падабалася. Таму пазычыў грошы і наладзіў бізнес.

— Цяпер, дзякуй богу, усё добра. Каля пяці гадоў не ўжываю. «Служу» ў суполцы ананімных наркаманаў. Мы ездзім у бальніцы і турмы да залежных, расказваем, што выйсце ёсць, людзі заўсёды могуць звярнуцца да нас у групу па дапамогу.

### «Рэгулярна прымаю тэрапію»

Задаю пытанне, якое немагчыма абысці: наколькі Сяргей з яго захворваннем можа выхоўваць дзіця? Мужчына запэўнівае: ён і будучая жонка выконваюць усе меры засцярогі, каб не заразіць дзяўчынку. Да таго ж ВІЧ не прастуда — па паветры не перадаецца.

За сваё здароўе Сяргей спакойны. Ён рэгулярна прымае антырэтравірусную тэрапію: па дзве таблеткі кожнай раніцай. Гэтыя лекі ён атрымлівае бясплатна. Раз на паўгода мужчына здае аналізы на імунны статус і вірусную нагрузку. Каб ацаніць апошні паказчык, лічаць, колькі ў пробе крыві клетак ВІЧ. Добры варыянт — гэта калі іх не могуць знайсці. На дадзены момант у Сяргея вірусная нагрузка «нуль» (гэта не значыць, што інфекцыя знікла, — проста «хворых» клетак настолькі мала, што сучасныя лабараторныя метады не могуць іх выявіць).

— Раней зімой хварэў, як і ўсе. А цяпер увогуле перастаў. Магу на скразняку пабыць — і нічога, максімум насмарк. Урачы кажуць, калі тэрапія падабрана правільна і ты не прапускаеш прыём таблетак, адказна ставішся да лячэння, то на працягласці і якасці жыцця інфекцыя не адаб'ецца.

Мужчына прытрымліваецца правільнага ладу жыцця. Сочыць за харчаваннем, займаецца фізічнай актыўнасцю. Некалі гэта была цяжкая атлетыка — з тых часоў у Сяргея засталася куча грамат і медалёў. Цяпер жа летам гуляе ў валейбол, зімой ганяе ў зале ў футбол. Любіць настольны тэніс.

Мужчына прызнаецца, што, калі даведаўся пра свой статус, доўга перажываў, што ніколі не стане татам. «Я вельмі баяўся, што маё дзіця народзіцца хворым. Але ўрачы кажуць, што калі прымаеш тэрапію, то шанцы мець здаровага малога большыя за 90 працэнтаў. Таму мы з маёй дзяўчынай плануем дзіця. Калі інфекцыяніст дасць дазвол, будзем нараджаць».

Наконт фінансавай забяспечанасці сям'і Сяргей не хвалюецца. Кажа, даходу ад бізнесу хапае. Прапаноўваў нават сваёй каханай сядзець дома і займацца хатнімі справамі, але той сумна без работы. Мужчына дапамагае грашыма таксама маме, якая ўжо на пенсіі.

Планаў на жыццё ў Сяргея наогул шмат. Ужо прадумаў вяселле: на ім не будзе алкаголю, бо мужчына не п'е (нават лекі не ўжывае, якія змяшчаюць спірт). А на 10-годдзе Веры купіць ёй жывёлу — дзяўчынка не раз прасіла, але тата лічыць, што пакуль рана. У тым, што ён убачыць, як дачка расце, мужчына не сумняваецца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

❍ КАМПЕТЭНТНА

### «ЗЫХОДЗІМ З ІНТАРЭСАЎ ДЗІЦЯЦІ»

У снежні мінулага года Міністэрства аховы здароўя зацвердзіла абноўлены пералік захворванняў, пры якіх нельга быць усынавіцелямі, прыёмнымі бацькамі, бацькамі-выхавальнікамі і апекунамі. У спіс не ўваходзіць ВІЧ **на пачатковых стадыях.**

— У нас цяпер выяўляльнасць дастаткова добрая. Вірус знаходзяць на ранніх стадыях, калі арганізм яшчэ не паспеў пацярпець ад яго. У чалавека, у якога своечасова злавілі ВІЧ, больш шанцаў пражыць да ўмоўных 80 гадоў, — кажа **намеснік галоўнага ўрача па амбулаторна-паліклінічным раздзеле работы Гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы Мінска Алег СКРЫПКО.**

Урач заўважае: выпадкаў бытавой перадачы гэтага віруса не ўстаноўлена. А значыць, дарослы не заразіць дзіця праз агульны посуд, расчоску ці ручнік. Але элементарныя меры засцярогі павінны быць. Усынавіцель таксама мусіць прымаць тэрапію. Заразнасць пацыентаў, у якіх не выяўляецца вірусная нагрузка, імкнецца да нуля.

Тыя, у каго трэцяя і чацвёртая стадыі ВІЧ, па-ранейшаму не могуць усынаўляць дзяцей.

— Гэта норма — не дыскрымінацыя. Мы зыходзім з інтарэсаў дзіцяці. Ёсць сумненні, ці не будзе дарослы хварэць, ці зможа паўнацэнна карміць і выхоўваць дзіця доўгі тэрмін. Мы не хочам, каб малы атрымаў другасную траўматызацыю: калі ён зноў застанецца без бацькоў, гэта дрэнна адаб'ецца на яго псіхіцы.

Чаму інфекцыяністы апасаюцца? У чалавека, які быў у глыбокай стадыі ВІЧ, адбываюцца змены ва ўнутраных органах — сэрцы, сасудах, нырках, магчыма, галаўным мозгу. Так, яму далі лячэнне, падавілі вірус. Але пацыент цалкам не аднавіўся. Няхай цяпер ён ружовашчокі прыгажун, паражэнні застаюцца. Звычайныя хваробы могуць развіцца значна хутчэй, чым у чалавека без ВІЧ. Напрыклад, атэрасклероз, гіпертэнзія. І інфаркты, і інсульты ў такіх пацыентаў адбываюцца на 10—15 гадоў раней, чым у агульнай папуляцыі. Таму стадыя не змяняецца на меншую.

Але Алег Скрыпко не выключае, што праз час спіс могуць зноў скарэктаваць і прыбраць цяперашняе абмежаванне.

— Разумееце, калі змены ўносіліся, яны шырока абмяркоўваліся сярод урачоў. І склалася агульнае меркаванне: давайце пойдзем пакрокава. Мы не можам адразу даць «зялёнае святло», не паглядзеўшы, што з гэтага атрымаецца. Трэба паназіраць, які будзе эфект. Колькі людзей з пачатковымі стадыямі ВІЧ захоча стаць усынавіцелямі, наколькі яны будуць гатовы ўтрымліваць дзяцей. Да таго ж распрацоўка лекаў хутка рухаецца наперад. Можа, праз пару гадоў прыйдзем да індывідуальнага падыходу ў пытаннях апекі. Тады ініцыіруем яшчэ раз уняссенне змен.

# «...ЯК ЗА КАМЕННАЙ СЦЯНОЙ»



Яўген КРЫЖАНОЎСКІ з дочкамі.

## «Кожны месяц праводзім кастынгі»

***— Нядаўна вы адзначылі дзень нараджэння. Задаволены тым, якім сустракаеце 64-ы год?***

— Часам задаюць пытанне: калі б вы нанова нарадзіліся, што памянялі б? Я б зноў пайшоў па гэтым шляху. Крыжаноўскі — гэта раўнабедраны трохвугольнік: сям'я, творчасць і палітыка (артыст з'яўляецца намеснікам старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі. — **Аўт.**). Без кожнага боку я не змагу жыць. Таму я задаволены сабой. Адзінае, не падабаецца мая вага (змагаюся з ёй ужо 15 гадоў) і ўзрост. *(Усміхаецца.)* Калі разумееш, што большая частка жыцця прайшла, становіцца горка і крыўдна, што так імкліва ўсё праляцела. Дзякуй богу, здароўе ёсць. Толькі што быў у «лечкамісіі» — я там абслугоўваюся як заслужаны артыст — на штогадовым медаглядзе і ўрач з усмешкай сказала: «Можна адпраўляць у дэсант».

***— Шмат працуеце?***

— Вельмі. Цяпер палова на дзясятую, а я ўжо з васьмі на рабоце. Ніхто, апроч мяне, сцэнарый не напіша, рэжысуру не прадумае. А дома колькі ні спрабаваў — працаваць не атрымліваецца: не тое месца. Хоць і камп'ютар ёсць, і дзеці на дыбачках ходзяць, каб не перашкаджаць.

**«Вось кажуць, што творчыя асобы ўсе гулякі, распуснікі, мнагажэнцы... Справа ў тым, што артыстам патрэбна менавіта другая палова, а не проста так, каб хтосьці быў побач».**

***— Тры гады таму вы адкрылі дзіцячую кінастудыю «Гумарынка». Лёгка працаваць са школьнікамі?***

— З дзецьмі вельмі цікава, але і цяжка. Здымкі троххвіліннай серыі ідуць тры гадзіны, але асноўны сюжэт трэба запісаць за 40 хвілін. Калі за гэты час не паспееў зняць самае галоўнае, ты праваліў заданне. Нездарма ўрокі ідуць 45 хвілін — потым школьнікі становяцца няўседлівымі. Рабіць перапынак падчас здымак катэгарычна забаронена, бо потым дзяцей увогуле не збярэш. Але мы метадам бізуна і перніка налаўчыліся запісваць серыі.

Малыя называюць мяне дзядзькам Жэнем. А некаторыя звяртаюцца афіцыйна — Яўген Крыжаноўскі. У нас ёсць традыцыя — абдымашкі: гэта зараджае энергіяй.

Кожны месяц мы праводзім кастынгі, нягледзячы на тое, што на студыі ўжо займаецца 90 чалавек, і гэтага хапае. Чаму? Шмат заявак прыходзіць. І кожны раз пераконваемся, што таленавітых дзяцей вельмі многа ў Беларусі. Мы арганізавалі свой лагер «Канікулы з «Гумарынкай», дзе школьнікі не толькі адпачываюць, але і знаёмяцца з азамі кінавытворчасці і літаральна з першых дзён пачынаюць здымацца.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Дзіцячы гумар адрозніваецца ад дарослага?***

— Так. Адказваючы на папрокі многіх калег, якія лічаць, што ў праграме прымітыўны гумар, хачу сказаць: інакш тут не можа быць! Дзеці не будуць смяяцца над двухсэнсоўнымі рэчамі ці паўнамёкамі. Ім трэба падаваць жарты проста. «Хлопчык, што гэта такое?» — кажа настаўніца, паказваючы на глобус. Той паглядзеў, пачухаў патыліцу: «Гэта чучала зямлі». Усё, дзеці смяюцца.

Матэрыялу для серый вельмі шмат. Гісторыямі дзеляцца і настаўнікі, і дырэктары школ, і бацькі. Толькі збірай і складай сюжэты.

## «Самае страшнае — гэта адзінота»

***— У адным інтэрв'ю вы казалі, што шкадуеце халасцякоў. Чаму?***

— Яны жывуць дарма — як і кожны, хто жыве толькі для сябе. Я сам быў халасцяком шмат разоў. Спачатку ты радуешся, што прыйшла свабода і ўсё, што зарабляеш, застаецца толькі табе. Але гэта пачуццё вельмі хутка праходзіць. Праз тыдзень разумееш, што няма з кім паразмаўляць. Праз тры ўжо выеш ад адзіноты. Самае страшнае — гэта адзінота. Калі прыходзіш дадому і няма побач цвёрдага мужчынскага ці мяккага жаночага пляча.

Вось кажуць, што творчыя асобы — усе гулякі, распуснікі, мнагажэнцы... Справа ў тым, што артыстам патрэбна менавіта другая палова, а не проста так, каб хтосьці быў побач. У некага атрымліваецца знайсці яе з першага разу, у мяне — не. Таму я пяць разоў быў жанаты. Але да ўсіх сваіх жанчын стаўлюся з вялікай павагай і лічу іх жонкамі і цяпер. Менавіта яны зрабілі тое, што сядзіць перад вамі. Бо калі б яны не займаліся мыццём, гатаваннем, дзецьмі, то я б не змог удзяляць час толькі творчасці. Я быў за жонкамі як за каменнай сцяной.

Мы ўсе падтрымліваем добрыя адносіны, сустракаемся. Такая вялікая сям'я — жанчыны і я. Чым магу, дапамагаю ім. Удзячны цешчам за тое, што даравалі мне сыходы ад іх дачок. Я, вядома, выключэнне з правіл, такога не бывае.

***— Няўжо ваша цяперашняя жонка Ганна спакойна ставіцца да таго, што частка грошай сыходзіць з сям'і?***

— Так. Яна сама кажа: «Жэня, трэба дапамагчы». Быў час, калі мы жылі толькі на Анін заробак, бо, калі толькі сустрэліся, маёй малодшай дачцэ ад папярэдняга шлюбу быў усяго месяц: як я не дапамагу? Я аддаваў усё ім. І ні слова Аня не сказала. Яе прыняла ў сям'ю цешча па былой жонцы. Калі мы ехалі на лецішча, яна сказала: «Жэнька, вязі сваю Аньку ўжо да нас». І фінал такі, як у фільме «Белае сонца пустыні»: «Спадар назначыў мяне любімай жонкай». Уяўляеце, мая былая стала хроснай мамай дачкі ад маёй новай жонкі. Святыя людзі!

***— Як вам удаецца сябраваць з імі ўсімі?***

— Я разумею, што нельга прычыняць боль роднаму чалавеку. Ведаю мужчын, якія б'юцца за кожную капейку, судзяцца з жонкамі за квадратныя метры. Я ўсё аддаваў — аўтамабілі, кватэры. Начаваў у машынах, у сяброў, усё нанова пачынаў. Магчыма, таму на мяне зла ніхто і не трымае.

## «Жанчына павінна быць гаспадыняй»

***— Чым скараеце спадарынь?***

— Не прыгажосцю, безумоўна. *(Усміхаецца.)* Скараў добрым пачуццём гумару (жанчыны танчэй яго ўспрымаюць, як і мастацтва ў цэлым), нейкім рыцарствам... Вось хто сёння пойдзе на дуэль дзеля жанчыны? Цяпер фішка — адкасіць ад арміі. У мой час не служыць было ганьбай: ты хворы! А зараз мамчыны сынкі вакол.

Рыцарскія паводзіны — гэта не толькі подзвігі: важныя дробязі. Выходзячы з аўтобуса, падаваць руку, не лаяцца пры жанчыне, хадзіць у краму і несці торбы. Жанчыны любяць вушамі: ім трэба чуць прыемныя словы. Але гэта разумееш толькі з узростам — па маладосці да народнай мудрасці не прыслухоўваешся. *(Смяецца.)*

**«Адказваючы на папрокі многіх калег, якія лічаць, што ў праграме прымітыўны гумар, хачу сказаць: інакш тут не можа быць! Дзеці не будуць смяяцца над двухсэнсоўнымі рэчамі ці паўнамёкамі».**

***— Самі што цэніце ў жанчынах?***

— Пачуццё гумару ў першую чаргу. Вытанчанасць мне падабаецца. Не люблю грубых жанчын. Але, мне здаецца, грубасць — гэта больш ахоўная абалонка: калі цябе з усіх бакоў крыўдзяць, можна стаць агрэсіўнай і злой.

***— З Ганнай вы разам больш за 20 гадоў. Чаму толькі пятая спроба пабудаваць сямейнае жыццё аказалася ўдалай?***

— Гэты шлюб чым шчаслівы? Бо сустрэліся дзіця і дарослы дзядзька, які з яго, як скульптар з легенды пра Галатэю, вылепіў сабе прыдатную пару. Калі мы пазнаёміліся, Ані было 19 гадоў, а мне — 42. Яна мяне на «вы» называла, гэта было так смешна. «Яўген Анатолевіч, можна я ў паход пайду?»... Аня расла разам са мной, убірала ў сябе ўсё, чым я жыву, — паходы ў тэатр, на здымкі. Мы разам глядзелі Таркоўскага і Данэлію. Мы думаем аднолькава. Неяк даў Ані спіс з 200 кніг, якія мусіць прачытаць кожны інтэлігентны чалавек. Яна прачытала іх усё. Я асіліў толькі палову. *(Усміхаецца.)*

Тое, што жонка маладзейшая за мяне на 23 гады, дае стымул трымацца. Заўсёды нашу касцюм: хачу падабацца жанчынам. Мужчына, які ходзіць у стаптаных чаравіках, у штанах, якія тапырацца, з пахам з рота, непаголены, з чорнымі пазногцямі, — не паважае сябе і іншых. У мяне тата быў такі ж, як я: у 70 гадоў прыхарошваўся перад люстэркам. Я таксама з раніцы прычэсваюся, адэкалонюся — хочацца быць прыгажуном.



З жонкай Ганнай і дачкой Ксюшай.

***— Думаю, вы павінны ведаць адказ на гэта пытанне: як утрымаць мужчыну ў сям'і?***

— Шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз страўнік. Закаханасць праходзіць, пачынаецца быт, і, калі жанчына не ўмее быць гаспадыняй, сужэнец сыдзе. Жанчына мусіць быць добрым псіхолагам: дзесьці падыграць, прытварыцца менш разумнай. Мужчына не любіць знявагі і каманды, таму трэба зрабіць, каб ён загадаў так, як патрэбна табе.

**«Калі гуляем з дочкамі, той, хто расказвае пра свой дзень, ідзе па цэнтры. Гэта дапамагае нам не страчваць тую сувязь, якой даўно няма ў многіх сем'ях».**

## «Усе святы адзначаем разам»

***— Як праводзіце час з сям'ёй?***

— Мы з жонкай шмат ходзім — па шэсць-восем кіламетраў у дзень. У нас некалькі маршрутаў: адзін — уздоўж Камсамольскага возера, другі — уздоўж Свіслачы праз парк Горкага. Мы не проста ходзім, а размаўляем. Калі гуляем з дочкамі, той, хто расказвае пра свой дзень, ідзе па цэнтры. Гэта дапамагае нам не страчваць тую сувязь, якой даўно няма ў многіх сем'ях. У 90 працэнтах сем'яў зносіны — гэта «прывітанне, як маешся, нармальна». Сын запёрся ў пакоі і гуляе, бацькі глядзяць тэлевізар, дачка балбоча па тэлефоне. Мы стараемся гэтага пазбегнуць.

**Не магу ездзіць на гастролі ці на міжнародныя фестывалі адзін. Пару разоў быў за мяжой без жонкі — вар'яцеў. Ну як захапляцца прыгажосцю вакол, калі побач няма чалавека, каб падзяліцца ўражаннямі?**

***— Ёсць у вас сямейныя традыцыі?***

— Усе святы адзначаем разам. Новы год старэйшыя дочкі, зразумела, сустракаюць у сваіх кампаніях, але хоць на хвілінку забегчы дадому — абавязкова. Калядуем па суседзях. Глядзім і рэкамендуем адно аднаму фільмы. Цяпер усёй сям'ёй падселі на тры серыялы — «Гульня тронаў», «Свет Дзікага Захаду» і «Перапраўа».

Адно з нашых агульных захапленняў — кераміка. Спачатку на курсы пайшла малодшая дачка, потым Аня зацікавілася. Цяпер з 15 чалавек у групе пяцёра Крыжаноўскіх. У нас дома ўжо няма звычайнага посуду: усе кубкі, талеркі, падносы, цукарніцы зроблены сваімі рукамі. А нядаўна нас запрасілі спусціцца па Нёмане на байдарках — тры дні падарожжа. Думаем паспрабаваць.

***— Хто выконвае ролю строгага бацькі?***

— Я вельмі мяккі чалавек. Усё звальваю на жанчын, бо хачу пражыць доўга і не псаваць сабе карму. *(Усміхаецца.)* Таму строгая ў нас мама. А я добры тата. Але часам бываю пудзілам, калі бачу, што дачка не слухаецца. Магу ўзяць рэмень: не б'ю — толькі раблю злы твар.

***— Вывелі для сябе формулу шчасця?***

— У кнізе «Як загартоўвалася сталь» Паўка Карчагін кажа: «Жыццё трэба пражыць так, каб не было нясцерпна балюча за бязмэтна пражытыя гады». Я б перарабіў канцоўку — «каб не было нясцерпна балюча за нецікава пражытыя гады». Даўно пераканаўся, што грошы не галоўнае. Можна і небагата жыць цікава. Самае каштоўнае — гэта сям'я і здароўе.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

**Фота з асабістага архіва героя.**

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ЛЁС МАЁЙ ПРАБАБУЛІ

**Гавораць, што чалавек жыве да таго часу, пакуль яго помняць. Мне здаецца, што памяць часу непадуладная.**

Свайго дзеда, Іосіфа Пракаповіча, я не памятаю. А вось прабабулю Антосю, маці майго дзядулі, якая памерла не так даўно, згадваем амаль кожны дзень.

Шмат чаго, што напісана ніжэй, мне неаднаразова даводзілася чуць ад прабабулі. А калі нельга было штосьці звязаць, дапамагала бабуля Зінаіда. Так ужо сталася, што прабабуля перажыла майго дзеда Юзіка, свайго адзінага сына, амаль на 10 гадоў. Няхай шчымлівая гісторыя маёй прабабулі стане прыкладам вытрымкі, цярпення і вялікай любові да жыцця.

Лёс гэтай жанчыны, Антаніны Мікалаеўны Філановіч — бабулі Антосі, — унікальны і непаўторны. У 1942 годзе яе, як самую меншую з дачок Пракаповічаў, адправілі гнаць скаціну ў Старобін. Гэтак жа, як і іншых маладых жыхароў вёскі Мілевічы (сённяшніх былых вязняў), павезлі на машынах-фургонах у Мінск, адтуль — у Германію.

Кожнага з палонных спасціг свой лёс. Бабуля Антося заўсёды прыгадвала, што ёй тады не было яшчэ і пятнаццаці гадоў. Ехала ў Германію і думала толькі аб тым, як там маці з пяццю старэйшымі сёстрамі. Пашанцавала ім: у час аблавы ўцяклі ў лес. Аднак няўмольны лёс распарадзіўся так, што праз месяц у лесе, калі маці ішла на хутар да сваёй сястры, яе застрэлілі нямецкія аўтаматчыкі.

А ў той час многія сяброўкі Антаніны Мікалаеўны і яна сама былі ў далёкай Германіі, горадзе Кістрыне. Хто трапляў да гаспадароў — таму было лягчэй: працавалі па хатняй гаспадарцы. Бабулі не пашанцавала: яна была самай малой з усіх і па гадах, і па росце, таму і трапіла ў агульнае месца жыхарства — стайню.Там жылі палонныя: асобна юнакі і асобна дзяўчаты. Кожны з іх ведаў свайго дзённага гаспадара. Менавіта яны і вызначалі, колькі і якой работы трэба было зрабіць за дзень. Пайкі для іх былі таксама розныя. Бабулі, як самай меншай, выдавалі паёк для непаўналетняй.



Прабабуля Антося з прадзедам Аляксандрам *(злева)*.

Працавалі пераважна на полі: саджалі капусту і іншую агародніну. Над рабочымі былі наглядчыкі, у параўнанні з гаспадаром вельмі жорсткія. Калі не будзеш працаваць, маглі адразу ж забіць. Калі-нікалі на поле заглядаў гаспадар. Пацягне за лісцік капусту, калі лісцік адарвецца — то добра пасаджана, калі выцягнецца каліўца разам з коранем — дрэнна. Часта за гэта каралі ўдарамі пугі.

Часта бабулю ахопліваў страх, што не выжыве, ніколі больш не сустрэнецца з маці і сёстрамі.

Разам з дзяўчатамі на полі працавалі і мужчыны-палякі. Да вайны бабуля скончыла чатыры класы польскай школы і добра размаўляла па-польску. Менавіта гаворка і агульны лёс зрабіў яе блізкай з палякам Юзікам Вайцюхоўскім. Праз усё жыццё пранесла яна каханне да гэтага чалавека. Нягледзячы на тое што жыў ён у такіх жа ўмовах, як і бабуля, штовечар прыбягаў да яе за чатыры кіламетры, а раніцай спяшаўся назад, каб ніхто не заўважыў, што яго не было. У стайні, акрамя бабулі, жылі яшчэ васьмёра дзяўчат. Спачатку яны спалі на сене, пазней зрабілі нары. Сяброўкі зайздросцілі бабулі: было каму яе і абняць, і пацалаваць. Любіла бабуля ўспамінаць: «Схаваемся мы з Юзікам у самы вугал канюшні і прагаворым усю ноч». У той час ёй было шаснаццаць. Не было ні стомы, ні незадаволенасці — толькі каханне.

У 1945 годзе, калі ўжо палонных вызвалілі, Юзік зваў яе з сабою, аднак яна не згадзілася: вельмі хацелася хутчэй сустрэцца з маці і сёстрамі. Каб на той час ведала, што маці ўжо няма, — паехала б з Юзікам. А тады, у 1945 годзе, яго, паляка, да нас не пусцілі... Антося адчувала, што нешта нездаровіцца, нядобра. І толькі калі прыехала дадому, зразумела: цяжарная. Юзік быў старэйшы за бабулю на чатыры гады.

Колькі лістоў ні пісала, усе назад прыходзілі: няправільны быў адрас.

Ужо тут, на радзіме, яна нарадзіла хлопчыка. Часта думала і паўтарала гэта і ў старасці: вось праклятая вайна, мала што мой лёс зламала, ды яшчэ і дзіця без бацькі расце. Назвала яна свайго хлопчыка Юзікам. І кожны раз, калі сынок пытаў, дзе яго бацька, яна тлумачыла, што ад яго табе засталося толькі імя.

Не разумелі яе сёстры, таму і вымушана была пайсці замуж за ўдаўца, у якога было сямёра дзяцей. Самай большай дзяўчынцы было дванаццаць гадоў, самай меншай — паўтара года. Адбылося гэта ў 1957-м. Антаніна Мікалаеўна працавала даяркай, а ўдавец Аляксандр быў загадчыкам на ферме. Муж яе па-свойму любіў і клапаціўся аб ёй. Бачыў, як пакутавала яна ад таго, што сёстры да яе не вельмі добра ставіліся і дапякалі яе любімым сыночкам. Па сутнасці, яна стала маці асірацелым дзецям, а вось агульных дзяцей Бог ім не даў.



Прабабуля з сынам і нявесткай (маім дзядулем і бабуляй).

Нядоўгім быў век яе сына Юзіка. Ва ўзросце пяцідзесяці гадоў ён раптоўна памёр. Да гэтага збіраўся разам з меншай дачкой напісаць на перадачу «Чакай мяне». Але ж не атрымалася... Бабулю Антосю, якой было ўжо за восемдзесят, вельмі шанавалі, любілі і яе дочкі-падчаркі, і ўнукі, і праўнукі.

**Мікіта Ефімовіч,**
**вучань 8 класа Мілевіцкага дзіцячага сада — базавай школы.**

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з невялікай гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца***

# СЕЛЕКТАР

З НЯДАЎНЯГА часу ў хаце пасяліўся «селектар». Як да Дарынкі, дык яна ўжо добра ведае, што гэта за дзіва.

У той дзень бацька прыбег на абед нейкі ўзбуджаны і адразу з парога заявіў мацеры:

— Таня, прыбяры з дзецьмі к заўтраму хату, папрыбірайце з вачэй лішняе латунне ў вугле каля тваёй машынкі і прыгатуй абед — дзесь яшчэ на двух-трох чалавек.

— Вой, што трапілася, хто будзе? Начальства якое з Гомеля?

— Ды не, не начальства. Нам будуць ставіць селектар. Я ж цяпер павінен быць на сувязі кругласутачна.

— Тата, а што гэта такое селектар? Тэлефон такі? А спаць ты зусім не будзеш? Каля тэлефона сядзець будзеш? А як ты вытрымаеш? — засыпала бацьку пытаннямі Дарынка з братам. Цяпер ёй ёсць чым пахваліцца перад сваімі сяброўкамі — селектарам. Гэта табе не мадзярон на двух колах, які трэба перці па рэйках з усяе сілы, калі ён чым-небудзь нагружаны.

Назаўтра ў хаце з'яўляюцца двое чужых мужчын з інструментам. Адзін з іх прымацоўвае да сцяны той селектар-тэлефон, другі чапляе дрот на сцяне хаты з вуліцы, а потым лезе на слуп з электрычнымі праводамі і падводзіць да яго адводак ад хаты. Уся работа займае некалькі гадзін. Потым тыя майстры правяраюць селектар у рабоце: з кімсьці размаўляюць па ім і, нарэшце, кладуць чорную бліскучую трубку на рычагі. Памыўшы рукі пад умывальнікам на двары, яны разам з бацькам абедаюць і з ім жа пакідаюць хату.

Ведаючы непаседлівы характар свайго малодшага сына, бацька пальцам грозіць яму, каб той не чапаў селектара, і вачыма паказвае яму на рэмень. Тут усё зразумела і так, без слоў, — і Дарынцы, і Шурку. Але хіба ж уцерпіш? Як толькі бацька зачыняе за сабой веснічкі, а маці выходзіць па нейкай справе з хаты, Шурка кідаецца да селектара і асцярожна здымае трубку. Дарынка побач чуе, як там у ёй нейкая незнаёмая цётка кажа:

— Алё! Дыспетчар слухае. Алё, каго вам трэба набраць?..

Шурка ад неспадзеўкі спачатку хоча кінуць трубку, але тут жа спахопліваецца і кажа той цётцы:

— Цётачка, набярыце нам нашу сястру на Данбасе. Яна туды завербавалася. Яе завуць Анюта. Мы вельмі па ёй сумуем, дык хоць паразмаўляем...

Ён яшчэ штосьці намагаецца сказаць таму дыспетчару, але спачатку чуе рогат, а потым суровае:

— А ну, пакладзі трубку на месца, падшыванец! Заняў мне тут лінію. Я вось бацьку твайму скажу, каб рэменем па мяккім месцы пахадзіў і адбіў табе ахвоту займацца дурасцямі.

Як абпёкшыся, Шурка асцярожна кладзе трубку на месца і заклапочаны адходзіць: «Адкуль тая цётка ў трубцы ведае іх бацьку? А што будзе, як яна раскажа пра яго непаслушэнства тату? Ну, ведама што — рэмень паходзіць па адным месцы».

Бацька размаўляе па селектары з начальнікам дыстанцыі. У гэты час усе, хто знаходзіцца ў хаце, павінны нават не варушыцца, каб не перашкаджаць яму дакладваць пра абстаноўку на ўчастку, які абслугоўвае яго акалодак. Дома ўсе ведаюць, што акалодак — гэта некалькі брыгад пуцейцаў, якімі камандуе бацька. Вось ён прыўстаў з табурэткі і штосьці шукае на стале сярод сваіх дакументаў. А Шурка тым часам без усялякай задняй думкі на дыбачках прыбліжаецца да яго, бярэ з-пад бацькі табурэтку і нясе яе да грубкі — закрыць засланку. Тая тырчыць пад самай столлю. Ён думае, што паспее гэта зрабіць, пакуль бацька шукае патрэбную паперу. Бацька, які не бачыў манеўраў сына, знайшоўшы патрэбную бумагу, машынальна садзіцца і тут жа падае на падлогу, але трубку з рук не выпускае. Як ні ў чым не бывала, ён, імгненна падхапіўшыся, працягвае гаворку. Добра што тэлефоннага кабеля хапае — мог бы пад цяжкасцю свайго цела вырваць са сцяны ўсё селектарнае прычындалле.

Дарынка са страхам глядзіць з печы, як бацька вешае на рычаг трубку, як разварочваецца і ідзе да рэменя, што вісіць на вушаку. Яго выгляд не прадвяшчае нічога харошага. Для брата.

Але, самлеўшы спачатку ад сваёй «работы», брат муталем заскоквае да яе на печ і жаласна просіць-кажа бацьку, што ён жа «не нарочна браў табурэтку, а каб зачыніць засланку, бо грубка выстыне». Бацька зараз жа разварочваецца назад і грозіць на печ папругай: «Глядзі мне, уседнік, другім разам пахаджу рэменем па ср...цы, дык будзеш знаць, калі закрываць тую засланку. Найшоў мне — калі». Так што з рэменем абышлося.

Пра селектар прачулі суседзі, дакладней — суседкі. Першай з'явілася Змітрыха, якая жыла насупраць. З парога, нават не прывітаўшыся з маці, яна з паштоўкай у руках прыступіла да справы:

— Слухай, Таня, воцета мне патрэбна свайму Валодзю патэлефанаваць у Хабараўск, дык ты скажы свайму Васілю, кеб заказаў па гэнаму сялехтару яго на заўтра.

Не паспела маці адказаць Змітрысе, як у хату ўскочыла Моця Баранчыха і пачала:

— Вось добра, што ў нас цяпер на вуліцы свой тэлефон будзе, а то кожны раз бяжы на тыя перагаворы на пошту. Дык дай, Танька-галубка, нумар таго чорта на сцяне, ну, сілектара ці як яго завуць, а я напішу яго сваім дзецям, каб жа не на пошту мяне выклікалі, а да цябе.

— Прохаравенька, набяры мне маю Соньку ў Гомлі, вось яе нумар, няхай на етыя выхадныя не едзе сюды, бо я сама на базар паеду і падкіну ёй усё, што трэба, — пацясніўшы першых суседак, у хату ўварвалася Ніла Канцавая (бо жыла ў канцы вуліцы).

— А Крэмль вам не набраць? — пачала рагатаць маці, а гледзячы на яе і Дарынка на печы. — Дзеўкі, гэта ж селектар, а не тэлефон просты вам. Па ім можа размаўляць толькі Васіль са сваім начальствам з Гомеля. Я ж бы і сваёй дзеўцы на Данбас патэлефанавала, каб магла, — паясняла маці суседкам, што гэта такое селектар.

Дарынка толькі моўчкі слухала, што казала маці сваім суседкам-сяброўкам па вуліцы. У той дзень, калі яго ўсталявалі, а дакладней вечарам, яны першыя з Шуркам, а за імі маці, прысталі да бацькі, каб той патэлефанаваў Анюце на Данбас і каму-небудзь яшчэ з родзічаў. Бацька доўга рагатаў, а потым, зняўшы трубку з рычага, сказаў у яе кодавыя словы:

— Алё, я ПЧ-19, дайце мне ПЧ-17.

Нават малая Дарынка ведала, што гэты код азначаў: ПЧ-19 быў яе бацька, а ПЧ-17 — яго начальнік у Гомелі. Пагаварыўшы з начальнікам дыстанцыі, бацька даў ім па чарзе паслухаць трубку. Але яна маўчала.

Адкуль жа суседкі, у якіх мужы працавалі абы-дзе, а не на чыгунцы, як яе бацечка, маглі ведаць пра такія прамудрасці? У той дзень яны ўсе пайшлі з хаты расчараваныя: «Што за тэлефон такі, па якім нямножна ні да кога дазваніцца? Абышто!» — чыталася на іх тварах.

**Раіса ДЗЕЙКУН.**

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

# ОАО «БНБ-БАНК»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 8 528 | 10 921 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 39 995 | 38 194 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 24 344 | 38 570 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 33 566 | 56 738 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 300 856 | 298 542 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 351 | 204 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 18 205 | 27 477 |
| 13 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 5 785 | - |
| 14 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 7 691 | 3 349 |
| 15 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 16 | Деловая репутация | | | - | - |
| 17 | Прочие активы | 1113 | | 7 244 | 7 451 |
| 18 | ИТОГО активы | 11 | | 446 565 | 481 446 |
| 19 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 20 | Средства Национального банка | 1201 | | 86 | - |
| 21 | Средства банков | 1202 | | 33 794 | 67 964 |
| 22 | Средства клиентов | 1203 | | 317 681 | 325 162 |
| 23 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 24 787 | 21 793 |
| 24 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 659 | 83 |
| 25 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 26 | Прочие обязательства | 1207 | | 3 386 | 2 167 |
| 27 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 380 393 | 417 169 |
| 28 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 29 | Уставный фонд | 1211 | | 11 075 | 11 075 |
| 30 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 31 | Резервный фонд | 1213 | | 6 400 | 6 400 |
| 32 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 11 028 | 11 244 |
| 33 | Накопленная прибыль | 1215 | | 37 669 | 35 558 |
| 34 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации-банку | | | 66 172 | 64 277 |
| 35 | Доля неконтролирующих акционеров | | | - | - |
| 36 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 66 172 | 64 277 |
| 37 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 446 565 | 481 446 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 1 квартал 2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 8 305 | 10 180 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 3 686 | 4 958 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 4 619 | 5 222 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 2 603 | 2 176 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 1 458 | 584 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 1 145 | 1 592 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | ( 67) | ( 42) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 3 005 | 2 647 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | ( 396) | ( 701) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | ( 466) | 1 581 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 3 329 | 341 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 9 133 | 4 291 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 343 | 283 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 2 625 | 2 904 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 730 | 344 |
| 17 | Прибыль (убыток) | 2 | | 1 895 | 2 560 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | - | - |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 20 | Итого прибыль (убыток) | | | 1 895 | 2 560 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации | | | 1 895 | 2 560 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | - | - |
| 23 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 24 | Базовая прибыль на простую акцию | | | | |
| 25 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | - | - |

Заместитель Генерального директора С. К. Сабук

Главный бухгалтер Н. П. Шнип

Дата подписания: 29 мая 2018 г.

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка:
**https://bnb.by/o-nas/nashi-rezultaty/bukhgalterskaya-otchetnost/**

**Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»**
Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, №10 от 07 июня 2013 г.
УНП 100513485.

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении публичных торгов в форме аукциона по продаже имущества ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок»

**Дата и время проведения: 17.07.2018 в 11.00.**
Прием заявлений участников на участие в торгах будет осуществляться с 9.00 15.06.2018 до 9.00 16.07.2018

| № лота | Наименование | Инв. № | Год выпуска, приобретения | Начальная цена, руб. | Шаг аукциона, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | здание склада ГСМ площадью 53 кв. м; адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Пролетарская, д. 46; расположено на земельном участке кад. №141000000003000649 железобетонная эстакада к ж/д путям инв. № 3004; открытая площадка склада трубных материалов инв. № площадь 4690,0 кв. м | 110/С-86824 | 1975 | 23 938,10 | 2 393,82 | 1 196,91 |
| 2 | здание компрессорной; общая площадь 51,0 кв. м; адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Пролетарская, д. 46; расположено на земельном участке с кадастровым № 141000000003000649 | 110/С-86823 | 1975 | 35 280,00 | 3 528,00 | 1 764,00 |
| | здание компрессорной; общая площадь 187,0 кв. м; адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Пролетарская, д. 46; расположено на земельном участке с кадастровым № 141000000003000649 | 110/С-86819 | 1980 | | | |

Продавец и организатор торгов: ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок», тел. +375 163 414964.

Организатор торгов ООО «Консалтингово-инжиниринговая компания «Правильные инвестиции», тел. +375 29 1070012.

Место проведения: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46 здание администрации.

Место нахождения предмета торгов: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Кроме того, представляются следующие документы:

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора) и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона;

доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.

Ознакомиться с предметами торгов можно по месту нахождения, предварительно согласовав дату и время с представителем продавца по тел. +375 29 8091058. Предметом торгов являются комплекты производственного оборудования, состоящие из отдельных лотов:

Лицо, желающее принять участи в торгах направляет в адрес организатора торгов заявление на участие в торгах с приложением документа об оплате задатка в сумме 5 % от начальной цены предмета торгов (лота, лотов). Организатор торгов обязуется в течение пяти рабочих дней заключить с лицом, желающим принять участи в торгах договор о задатке. Задаток перечисляется участником торгов на расчетный счет организатора торгов. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение десяти рабочих дней со дня их проведения.

По результатам торгов организатором торгов составляется протокол, подписываемый всеми участниками аукциона.

С победителем торгов продавцом в срок не позднее 15 рабочих дней от даты подписания протокола о результатах торгов заключается договор купли-продажи. Приобретенный предмет торгов оплачивается участником, выигравшим торги не позднее 3 рабочих дней от даты заключения договора купли-продажи. Участник, выигравший торги, помимо прочего возмещает затраты на организацию и проведение торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов может быть подан этому участнику по цене, превышающей начальную на 5 %.

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 16 июля 2018 года в 11.00 открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего республиканскому унитарному предприятию «Производственное объединение «Белоруснефть» на праве хозяйственного ведения

| № лота | Инв. № | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, рублей (без НДС*) | Задаток, рублей (без НДС*) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1141 | Машина плосковязальная TECHNOT EX кл.10 | Предназначена для изготовления изделий регулярным (вывязывание по контуру) и полурегулярным (с подрезкой) способами. Машина-автомат с программным управлением, подключение 380 V | 1 267,23 | 127,00 |
| | | | | * без НДС согл. п.п. 2.3 п. 2 ст. 93 НК РБ | |

Местонахождение имущества: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, головные сооружения РУП «Производственное объединение «Белоруснефть»

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 13 июля 2018 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 11.00 **16 июля 2018 г**. Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Аукционные торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. N 609. **Шаг аукциона – 5 %.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**К заявлению на участие в аукционе прилагаются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора торгов, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или трудовой договор (контракт), или иные документы в соответствии с законодательством). В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с №BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 14 июня 2018 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), будет засчитан в счет окончательной стоимости предмета торгов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить предмет торгов) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола аукциона возместить Организатору затраты на организацию и проведение аукциона, об утвержденной сумме которых уведомляется перед началом аукциона; в течение 10 календарных дней после подписания протокола аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов; в течение 10 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость предмета торгов, сформированную в установленном порядке.

